УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дарожным дадаткам) «Прафрух»
На 1 мес. . . — 90 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.
Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „Зьвязда" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок нспр. пасьля тэксту—5 к. Іншагародніх абвестак—1 р. За радок. Паскрод тэксту—у два разы дарожэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 процантаў.

Эпл. Москва, Библиотека ВСНХ СССР Ст.Сьн /Зв. I/

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАЇН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
„ абвестак . . 7-81

АЎТОРАК
22 красавіка 1930 г.
№ 94 (3602)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА
МЕНСК, Савецкая, 63.

Сёньня—шасьцідзесяцігодзьдзе з дня нараджэньня вялікага правадыра рэвалюцыйнага пралетарыяту, Ул. Іл. Леніна

ВЫКАНАЕМ ЛЕНІНСКІЯ ЗАВЕТЫ

Сёньня 22-га красавіка спаўняецца 60 год з дня нараджэньня У. І. Леніна—найвялікшага правадыра сусьветнага пралетарыяту, арганізатара вялікага Кастрычніка.

У дзень нараджэньня свайго вялікага правадыра сусьветны пралетарыят скарыстае для мабілізацыі сваіх сіл супроць імпэрыялізму і яго пёканёў сацыял-фашыстых. Пралетарыят СССР і бядняцка-серадняцкае сялянства скарыстаюць гэты вялікі дзень для таго, каб яшчэ з большай энэргіяй і дысцыплінаванасьцю выконвалі 5-цігадовы плян народнай гаспадаркі, замацоўвалі і пашыралі калектывізацыю, узьнімалі прадукцыйнасьць працы, узмацняли абароназдольнасьць краіны, ажыцьцяўляли задачы культурнай рэвалюцыі.

Лепшай адзнакай памяці нашага правадыра У. І. Леніна зьяўляецца праверка буйной машыннай індустрыі, якія ён ставіў перад пралетарыятам і партыяй.

З гэтых ленінскіх задач індустрыялізацыя краіны—асноўная. Мы маем непасрэднае ўказаньне Леніна аб тым, што пралетарыят павінен перасесьці «на каня буйной машыннай індустрыі, электрафікацыі, Валхаўстрою і г. д. Выконваючы гэтыя ўказаньні Леніна, пралетарыят, пад кіраўніцтвам ленінскай партыі, пасьпяхова пасоўваецца наперад, выконваючы першую пяцігодку за чатыры гады, будуючы ў розных канцох неабсяжнага Савецкага Саюзу дзесяткі новых гігантаў—фабрык, домкраў, сотні і тысячы кілёмэтраў новых чыгунак, сацыялістычныя гарады. Ленінскі лёзунг «дагнаць і выперадзіць у тэхніка-эканамічных адносінах перадавыя капіталістычныя краіны» выконваецца з посьпехам. Савецкі Саюз на нашых і на вачох нашых ворагаў становіцца краінай перадавой тэхнікі і сацыялістычнай культуры. У адпаведнасьці з указаньнем Леніна аб тым, што «прадукцыйнасьць працы — гэта ў апошнім падрахунку самае важнае, самае галоўнае для перамогі новага грамадзкага ладу», пралетарыят Савецкага Саюзу разьвівае сацыялістычнае спаборніцтва, ударніцтва, якое ахапляе сабою заводы, фабрыкі, цэхі, капальні. Пралетарыят БССР за пасьпяховае выкананьне прамфінпляну—гэта ёсьць непасрэднае выкананьне ўказаньняў Леніна аб прадукцыйнасьці працы. На гэтым шляху пралетарыят павінен і будзе з неаслабнай энэргіяй працаваць надалей.

Пасьпяховае выкананьне ленінскага пляну індустрыялізацыі і электрафікацыі краіны стварыла патрэбную глебу для сацыялістычнай рэканструкцыі дробнае сялянскае гаспадаркі. Гэта зьяўляецца адной з галоўнейшых дырэктыў Леніна нашай партыі. Выконваючы яе, даючы рашучы адпор правым апартуністым, якія не разумеюць гэтай ленінскай дырэктывы, наша партыя дабілася таго, што ў калгасы пашоў ня толькі бядняк, але і серадняк. Калгасны рух на справе стаў рухам мільёнаў.

Парушэньні ленінскіх указаньняў аб добраахвотнасьці калектывізацыі, практыка адміністраваньня, «галавакружэньне ад посьпехаў» былі прычынамі таго, што ў радзе месц меліся адлівы з калгасаў часткі калгасьнікаў. Дырэктывы Леніна аб необходнасьці бераргы саюз пралетарыяту з серадняком былі ў гэтых мясцох пастаўлены пад пагрозу. Партыя ў сваіх пастановах і ў артыкулах тав. Сталіна сыгналізавала гэту небясьпеку, завастрыўшы ўвагу на барацьбе супроць перагібаў. «Левыя» загібы зьяўляюцца адной з галоўных перашкод на шляху далейшых посьпехаў калектывізацыі і ўзбройваюць правых апартуністых. Вось чаму партыя патрабуе самай бязьлітаснай барацьбы з перагібамі, не пакідаючы барацьбы з правым ухілам, галоўнай небясьпекай. Цэнтральная дырэктыва нашай партыі ў калгасным руху зараз зводзіцца да таго, каб арганізацыйна замацаваць калгасы, на гэтай аснове пабальшавіцку правесьці веснавую сяўбу і рухацца наперад.

Трэці момант, які мы павінны адзначыць у гэты дзень—выкананьне задач культурнай рэвалюцыі. Мы можам канстатаваць тут рад нясумненных буйных посьпехаў: рост ліквідаваўшых няпісьменнасьць, увядзеньне ўсеагульнага навучаньня, рост ініцыятывы рабочых кадраў і г. д. Цэнтральная задачай зараз зьяўляецца падрыхтоўка пралетарскіх кадраў спэцыялістых. Дырэктывы лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б) ствараюць магчымасьці для выкананьня гэтай вялікай задачы. Наяўнасьць шматлікіх фактаў шкодніцтва ў прамысловасьці, варожыя выступленьні на культурным фронце і г. д. яшчэ раз абавязваюць нас ужыць усё магчымае для таго, каб з посьпехам і ў магчыма хутчэйшы тэрмін вырашыць праблему пралетарскіх кадраў. Адначасова на базе тых посьпехаў, што ўжо ёсьць, мы павінны памножыць сваю энэргію ў справе ліквідацыі няпісьменнасьці працоўных, пашырэньні ўсеагульнага навучаньня, як таго адзінага сродку, які ў корані падрэзвае масавую няпісьменнасьць. Мы павінны таксама ўзмацняць нашу марксыцка-ленінскую прапаганду і анты-рэлігійную прапаганду, вырываючы працоўныя масы з-пад уплыву папоў, царквы і сэктантаў.

Вілавочныя посьпехі ў правядзеньні ленінскай нацпалітыкі—вось чацьверты момант, які мы можам сёньня адзначыць. БССР сапраўды зьяўляецца краінай братэрскага супрацоўніцтва некалькіх нацыянальнасьцяй. Разам з посьпехамі беларусізацыі і беларускай пралетарскай культуры разьвіваюцца і культуры нацменшасьцяй—яўрэйская, польская, латыская, літоўская і інш. Праводзячы работу на роднай мове кожнай нацыянальнасьці, змагаючыся з шавінізмамі ўсіх адценьняў, асабліва з беларускім нацыянал-дэмакратызмам, як найбольш небясьпечным зараз, наша партыя выхоўвае рабочую клясу і працоўных у духу інтэрнацыяналізму, клясавай сьвядомасьці, падкрэсьліваючы патрэбнасьць змагацца з кулаком і нэпманам, ня гледзячы на іх нацыянальнасьць. Дзякуючы гэтай ленінскай нацыянальнай палітыцы, БССР стала тым пунктам, да якога ідуць сымпатыі рабочых і сялян Заходняй Беларусі, прыгнечаных абсацам польскага фашызму.

Узмацненьне абароназдольнасьці Савецкага Саюзу—вось пятае зьвяно з тых пытаньняў, якія мы павінны праверыць сёньня. Усе апошнія факты і падзеі з міжнароднага становішча: крыжовы паход на чале з рымскім папаю, так званая справа Куцепава, шалёная антысавецкая кампанія ў Польшчы і, нарэшце, справа «Саюзу Вызваленьня Украіны»—усё гэта паказвае, што міжнародны імпэрыялізм шырокім фронтам падрыхтоўвае паход супроць Савецкага Саюзу. Вакол гэтага паходу аб'ядноўцца ўсе сілы імпэрыялізму—ад сацыял-згодніцкіх да рымскага папы. Сусьветны пралетарыят адзначыць дзень нараджэньня Леніна заклікам да адданай абароны СССР—адзінай сацыякаўшчыны ўсіх пралетараў. Наш абавязак зрабіць усё, каб у надыходзячым нападзе наш клясавы вораг сустрэў такі адпор, як ён ужо сустрэў нядаўна на Далёкім Усходзе. Асоавіяхім, арганізацыя, узьнікшая на падставе ініцыятывы рабочых і сялян, павінен стаць тым асноўным органам, які падрыхтоўвае самыя шырокія масы ў справе абароны краіны. Камуністы, члены Асоавіяхіму, павінны паказаць узор гэтай важнейшай работы.

Нашы вялікія посьпехі ў сацыялістычным будаўніцтве змушаны [illegible] нават нашы клясавыя ворагі. Гэтыя посьпехі былі магчымы толькі таму, што на чале рабочай клясы і бядняцка-серадняцкіх мас нязьменна стаяла і нязьменна выконвала ленінскія заветы наша УсеКП(б). Выконваючы ўказаньні Леніна—бераргы адзінства сваіх радоў—наша партыя здолела да канца разграміць трацкізм, а пасьля гэтага выкрыць перад масамі антыленінскую сутнасьць правага ухілу—галоўнай небясьпекі на даным этапе. Нязьменна праводзячы ленінскую генэральную лінію, партыя змагла мабілізаваць мільённыя масы пад лёзунгамі сацпаборніцтва, ударніцтва, прыняўшы ў свае рады дзесяткі тысяч новых ленінцаў-ударнікаў. Разам з тым партыя дабілася ўмацаваньня саюзу пралетарыяту і бедноты з серадняком. На падставе шырокага руху бядняцка-серадняцкіх мас пасьпяхова ажыцьцяўляецца лёзунг ліквідацыі кулацтва, як клясы, у раёнах суцэльнай калектывізацыі. Партыя рашуча змагаецца з усімі тымі, хто прабуе падрываць гэты саюз з серадняком практыкай перагібаў і адміністраваньня. Узмацняючы гаспадарчыя і арганізацыйна калгасы, партыя яшчэ больш замацоўвае саюз пралетарыяту і бедноты з серадняком.

Перад тварам вялікіх задач і бояк з клясавым ворагам мы можам сказаць словамі т. Сталіна: «Партыя наша моцна і непераможна таму, што, кіруючы рухам, яна ўмее захоўваць і павялічваць сувязі з мільённымі масамі рабочых і сялян».

У БАРАЦЬБЕ СУПРОЦЬ СКРЫЎЛЕНЬНЯЎ ПАРТЫЙНАЙ ЛІНІІ У КАЛГАСНЫМ РУХУ

ЦК УсеКП(б) у поўнай адпаведнасьці з ленінскімі заветамі даў цьвёрдую і ясную дырэктыву аб необходнасьці поўнага захаваньня прынцыпу добраахвотнасьці пры калектывізацыі, аб необходнасьці поўнага ўліку рознастайнасьці канкрэтнай абстаноўкі, даў зусім ясную і выразную дырэктыву аб тым, што асноўным зьвяном калгаснага руху на даным этапе зьяўляецца с.-г. арцель, аб недапушчальнасьці пераскоквання праз незадзіраную лінію форму руху. ЦК УсеКП(б) у сэнсе сурэзнасьцю напрадкладваў партыйным арганізацыям супроць якога-б там ні было «дэкретаваньня» зьверху калгаснага руху, якое магло стварыць небясьпеку падмены сапраўднага сацыялістычнага спаборніцтва на арганізацыі калгасаў гуллёю ў калектывізацыю. Такое-ж рашэньне прыняў і студзеньскі пленум ЦК КП(б)Б.

Толькі на аснове сапраўднага правядзеньня гэтых ленінскіх дырэктыў наша партыя мы дабіліся таго, што «кранны паварот вёскі да сацыялізму можна лічыць ужо забясьпечаным».

Мы маем вялізарнейшыя посьпехі ў галіне калгаснага будаўніцтва. Але-ж на аснове гэтага шпаркага росту калгаснага руху ў раду пасобных прадстаўнікоў партыі зьявілася «галавакружэньне ад посьпехаў». Вялікая часта нарадкладаюць празьмерную самаўпэўненасьць і зазнаўства. «Тут зусім магчыма вера ва ўсемагутнасьць дэкрэту, рэзалюцыі і загаду. Тут зусім рэальна небясьпека абарачэньня разумнасьцяй мерапрыемстваў партыі ў пустое чынопчае дэкрэтавальнае» (Сталін). На гэтай глебе і узьнікі памылкі і скажэньні партыйнае лініі ў калгасным руху.

Гэтыя памылкі калі мы іх ня ліквідуем «відуць нас простымі зносінамі да разладу з серадняком, да дэарганізацыі беднаты, да паслабленьня усяго нашага сацыялістычнага будаўніцтва за адпаўзаньня кулацтва. Гаворачы коратка гэтыя памылкі маюць тэндэнцыю сапхрэнуць нас з шляху узмацненьня саюзу з асноўнымі масамі сялянства, з шляху узмацненьня пралетарскай дыктатуры на шлях падрыву пралетарскай дыктатуры.

Гэтыя «левыя» памылкі і перагібы, якія выражаюцца у неправільным падыходзе да серадняка, якія выказаліся ў спробах дэкрэтаваць калгасны рух зьверху, у спробах перасокчыць праз ступень нецярэдна да камуны, у адмове ад уліку рознастайнасьці канкрэтнай абстаноўкі — сталі асноўным тормазам для разьвіцьця калгаснага руху. Гэтыя памылкі і перагібы — яны, галоўным чынам, прывялі да таго, што мы мелі ў радзе месц адлівы адліву серадняцкую з калгасаў.

Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) сваімі пастановамі і артыкуламі т. Сталіна ўдарылі па гэтых перагібах, вызначылі далейшыя шляхі да замацаваньня калгаснага руху, да забясьпечэньня далейшага прасоўваньня наперад.

Правыя апартуністы і «левыя» загібчыкі зьяўляюцца прынцыпамі генэральнай лініі нашай партыі. Правыя апартуністы і «левыя» загібчыкі на сутнасьці змыкаюцца ў сваіх выступленьнях супроць генэральнай лініі нашай партыі. Правая небясьпека зьяўляецца галоўнай небясьпекай. Але «сваяасабліваець момату, які мы перажываем, заключаецца ў тым, што барацьба з памылкамі «левых» загібчыкаў зьяўляецца у нас умовай і сваеасаблівай формай пасьпяховай барацьбы з правым апартунізмам». «Каб змагацца з посьпехам з правым апартунізмам трэба перажаны памылкі «левых» апартуністых». (Сталін).

Партыя разгортвае бальшавіцкую самакрытыку і з усёй бязьлітаснасьцю выкрывае памылкі, дапушчаныя радам партыйных арганізацый. З усёй рашучасьцю партыя разгортвае бальшавіцкую самакрытыку, адкрывае жорсткі агонь супроць усялякіх спроб замазаць свае памылкі, настоваць на іх. Разам з гэтым трэба адкрыць самы жорсткі агонь супроць спробаў правых апартуністых пад сьцягам «самакрытыкі» выкрыцьцяць ленінскае кіраўніцтва Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б), супроць спробаў правых апартуністых шкуць ЦК УсеКП(б) паклёпніцкіх абвінавачэньняў у трацкізме. Трэба даць рашучы адпор «левым» і правым апартуністым.

У Беларусі на аснове правільнай ленінскай лініі ЦК УсеКП(б) мы дабіліся вялізарных дасягненьняў у справе калгаснага руху. Але трэба сказаць проста, што радам партыйных арганізацый КП(б)Б былі дапушчаны скажэньні і скрыўленьні правільнай партыйнай лініі.

Рад нашых партыйных арганізацый, не ўлічваючы канкрэтнай абстаноўкі, нагадзеў за нерэальнымі тэмпамі калгаснага руху, не забясьпечыўшы замацаваньня калгасаў, не вядучы работы сярод беднаты і г. д. Рад партыйных арганізацый узяў курс на 100 проц. калектывізацыю округ да вясны 1930 году і ў гэтых округах (Мазыр, Магілеў і г. д.) асабліва моцныя былі перагібы.

У выніку гэтых перагібаў і скажэньняў партыйнай лініі, у сувязі з невысакарыснай работай сярод беднаты, якая суправаджалася часта ў радзе месц крыўдзячымі адносінамі да кулака, у сувязі з антысерадняцкімі перагібамі, з пробамі раскулачваць серадняка, узмацніліся хіснаньні серадняка. Істотнай прычынай адліву з калгасаў зьяўляецца перагібы і скажэньні партыйнай лініі. Работа праведзеная партыйнай арганізацыяй па выпраўленьні дапушчаных памылак, на ўзмацненьні партыйнага кіраўніцтва ў тых месцох, дзе яно аказалася пэздольным праводзіць генэральную лінію партыі, прывяла да далейшага замацаваньня калгасаў.

Усе памылкі і скрыўленьні партыйнай лініі партыйная арганізацыя выкуляе і выкрывае на аснове жорсткай самакрытыкі.

Пастанова бюро ЦК КП(б)Б, якая пуб-ліку[illegible]ецца сёньня, бяро пад агонь крытыкі і самакрытыкі памылкі, дапушчаныя ў справе калгаснага будаўніцтва. Камуністычная партыя Беларусі стаіць на чале масавага калгаснага руху. У барацьбе з апартунізмам забясьпечыла яна размах калгаснага руху, замацаваньне калгасаў. У барацьбе супроць тэарэтыкаў «саматёчнога» разьвіцьця, супроць авантурыстскіх «левых» элементаў яна забясьпечыла сацыялістычную перабудову вёскі.

Бюро Цэнтральнага Камітэту нашай партыі ў сваёй пастанове гаворыць, што «праводзячы правільную палітычную лінію ў калгасным будаўніцтве, ЦК КП(б)Б дапусьціў, адмак, асобныя памылкі, якія выявіліся ў наступным: бюро ЦК лічыць, што яно не дало своечасовага растлумачэньня адпору памылковым тэндэнцыям раду парторганізацый скопчыць суцэльную калектывізацыю гэтай вясной. Бюро ЦК лічыць, што дырэктыва студзеньскага пленуму «разгарнуць шырокую кампанію агрэмаджаньня жывёлы і кармоў, як у арганізаваных калгасах, так і ў тых, якія будуць арганізоўвацца» была памылкова таму, што ня было паказана, што гэтае ідзе аб агрэмаджаньні рабочай і таварна-прадукцыйнай часткі рагатай жывёлы. Бюро ЦК КП(б)Б лічыць, што дырэктыва студзеньскага пленуму «даручыць НКЗ і Калгаспэнтру тэрмінова распрацаваць статут с.-г. арцелі, якім прадугледзець усе гэтыя моманты з тым, каб максымальна забясьпечыць пераход ад с.-г. арцелі да камуны»—была несвачасова таму, што яна магла садзейнічаць узмацненьню тэндэнцый, якія меліся на мясцох, да пераскоквання ад арцелі да камуны. Бюро ЦК КП(б)Б адзначае, што ім была дапушчана памылка ў яго пастанове аб необходнасьці забраць рад прамысловых прадпрыемстваў у местачковых прадпрыемцаў. І што гэтая пастанова бюро ЦК ад 25-га лютага была перагледжана і адмецена 19-га сакавіка. Бюро ЦК адзначае таксама, што пастанова студзеньскага пленуму КП(б)Б аб калектывізацыі да вясны 1930 г. на мэнш 35 проц. яравога кліну, не магла зьвяцца прычынай няправільнай пастаноўкі пытаньня аб тэмпах калектывізацыі з боку раду мясцовых арганізацый. Бюро ЦК, аднак, адзначае, што гэта пастанова ў той частцы, у якой яна ўстанаўляе тэрмін поўнай калектывізацыі БССР да канца 1931 году, не адпавядае пастановам ЦК УсеКП(б). Выходзячы з гэтага, а таксама ўлічваючы пэрспэктывы разгортваньня калгаснага руху, бюро ЦК пастанаўляе зьвярнуцца да пленуму з прапановай зьмяніць гэтую пастанову студзеньскага пленуму, паставіўшы задачай правядзеньне поўнай калектывізацыі БССР у дакладнай адпаведнасьці з пастановамі ЦК УсеКП(б)—у працягу пяцігодкі».

Гэта пастанова бюро ЦК КП(б)Б, якая крытыкуе як памылкі, дапушчаныя ў мясцох, так і памылкі, дапушчаныя з боку ЦК, зьяўляецца дакумэнтам вялікай палітычнай вагомасьці. З бальшавіцкай непрымірымасьцю і жорсткасьцю, камуністычная партыя Беларусі, пад кіраўніцтвам яе Цэнтральнага Камітэту, выкрывае дапушчаныя скажэньні скрыўленьні партыйнай лініі, выкрывае дапушчаныя памылкі, з тым, каб усёй рашучасьцю на аснове мабілізацыі ўсіх сіл партыі [illegible] арганізацыі, адолець далейшае [illegible] і выкрывае прасоўваньне наперад.

Наша прэса дапусьціла рад пасобных памылак, якія скажэньні партыйнай лініі. «Зьвязда» ўвесь час [illegible] на варце ленінскай лініі нашай партыі, вяла жорсткую барацьбу супроць апартуністычных наскокаў на лінію партыі, супроць правага апартунізму, супроць галоўнай небясьпекі, і супроць левых загібаў. Пры асноўным правільным лініі нашай газэты [illegible] дапушчаны пасобныя памылкі. Асноўная памылка заключалася, у тым, што наша газэта не дала адпору [illegible] тэмпамі калектывізацыі, і [illegible] «Зьвязда» не заўсёды [illegible] ўвагі на патрабе [illegible] работы, пясе частку [illegible] не тэмпаў калектывізацыі. У газэце [illegible] дапушчана памылка, [illegible] над правільным артыкулам [illegible] палітычна няправільны загаловак «Раскулачваньне—асноўны [illegible] посьпеху супольнай калектывізацыі».

На аснове ажыцьцяўлення генэральнай лініі нашай партыі, [illegible] барацьбу супроць «левых» і супроць правых—[illegible] на даным [illegible] бальшавіцкую самакрытыку [illegible] рашучы адпор спробам [illegible] элементаў пад сьцягам [illegible] выступаць супроць [illegible] лініі нашай партыі, [illegible] ідуць праз [illegible] мы пасьпяхова будзем [illegible] задачы, пастаўленыя [illegible] нашай партыяй.

РЭЗАЛЮЦЫЯ БЮРО ЦК КП(б)Б

(ад 17-IV-30 г.)

1. Правільная палітычная лінія ЦК УсеКП(б) у пытаньнях калгаснага будаўніцтва і ліквідацыі кулацтва, як клясы, на падставе суцэльнай калектывізацыі была скажана радам мясцовых партыйных арганізацый УсеКП(б) і ў тым ліку і ў КП(б)Б.

Бюро ЦК КП(б)Б прызнае бязумоўна своечасовай і правільнай ацэнку, даную ў пастановах ЦК УсеКП(б) і артыкулах тав. Сталіна «Головокружение от успехов» і «Адказы таварышам калгасьнікам» тым палітычным памылкам і грубейшым скрыўленьням партыйнай лініі, якія меліся на мясцох.

2. Гэтыя скрыўленьні лініі партыі выявіліся перш за ўсё ў небальшавіцкім падыходзе да серадняка. Замест растлумачальнай работы і перакананьня серадняка ў пераваге калгасаў перад індывідуальнай гаспадаркай шляхам паказу гэтага на справе, — рад арганізацый ужывалі мэтады прымусу і адміністраваньня. Асобныя члены партыі дайшлі пры гэтым да грубога гвалту, іншы раз нават ужываючы ў адносінах да нежадаючых увайсьці ў калгас арышты. Парушэньне добраахвотнасьці калгаснага руху, якое стварыла пагрозу паслабленьня ці нават разрыву саюзу рабочае клясы з асноўнымі масамі сялянства, знаходзілася і знаходзіцца ў поўнай супярэчнасьці з асноўнымі ўказаньнямі партыі. Гэтыя ўказаньні знаходзяцца ў пастановах лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б), у пастанове ЦК УсеКП(б) аб тэмпах калектывізацыі («Правда» ад 6-га студзеня), а таксама ў пастановах студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б, напрэдзіўшага мясцовыя партыйныя арганізацыі аб недапушчальнасьці адміністраваньня і гульні ў калектывізацыю і рашуча падкрэсьліваўшага, што калгасны рух можа будавацца толькі на падставе сапраўднай актыўнасьці батрацка-бядняцкіх і серадняцкіх мас вёскі.

3. Памылкі і скажэньні, дапушчаныя асобнымі партыйнымі арганізацыямі пры ажыцьцяўленьні задачы ліквідацыі кулацтва, як клясы, знаходзіліся ў тым, што раскулачваньне у радзе выпадкаў праводзілася не на падставе суцэльнай калектывізацыі і часамі закранала серадняка. Гэтыя памылкі і скажэньні ў справе раскулачваньня таксама знаходзяцца ў яўнай супярэчнасьці з дырэктывамі ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б.

4. Ня гледзячы на простыя і неадназовыя дырэктывы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб узмацненьні работы з беднатой і батрацтвам, як асноўным вагаром калгаснага будаўніцтва, ня гледзячы на тое, што ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б вызначалі недаацэнку важнасьці работы з беднатой і батрацтвам, як правы правага апартунізму на практыцы, работа па арганізацыі батрацтва і беднаты валася далёка невыстарчальна. У выніку гэтага палітычная масавая работа ў галіне калгаснага будаўніцтва часамі падмянялася адміністраваньнем.

5. Ня гледзячы на пастановы студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б, які паставіў задачай мясцовых партыйных арганізацый дабіцца да вясны 1930 г. ахопу калектывізацыяй 35% яравога кліну, — рад партыйных арганізацый фактычна не кіраваліся гэтай пастановай ЦК КП(б)Б, а імкнуліся правесьці стопроцантную калектывізацыю да гэтага тэрміну. Такія тэндэнцыі падтрымліваліся і заахвочваліся нават некаторымі акруговымі камітэтамі партыі. (Мазыр, Магілеў, Віцебск).

Фарсаваныя, нерэальныя тэмпы калектывізацыі без выстарчальнага ўліку якасьці работы, выкоўваньне лёзунгу «раскулачваньне—асноўны сродак посьпеху супольнае калектывізацыі»).

9. ЦК КП(б)Б рашуча стаў на шлях неадкладнага выпраўленьня памылак і скажэньняў у калгасным будаўніцтве, што з усёй сілай было пастаўлена ў пастановах сакавіцкага пленуму ЦК КП(б)Б.

Лічачы пастановы ЦК УсеКП(б) і ўказаньні, якія знаходзяцца ў артыкулах т. Сталіна, адзінай правільнымі і адкрываючымі шлях да сапраўды моцнага будаўніцтва калгасаў, тым самым да сацыялістычнай перабудовы сельскае гаспадаркі, ЦК КП(б)Б на сакавіцкім пленуме даў рашучы адпор спробам з боку некаторых мясцовых партыйных арганізацый (Шклоў і інш.) супраціўляцца выпраўленьню перагібаў і скажэньняў лініі партыі.

10. Бюро ЦК КП(б)Б, канстатуючы, што мясцовыя партыйныя арганізацыі ў асноўнай масе ўжо выпраўляюць дапушчаныя скрыўленьні і памылкі, заклікае ячэйкі і больш рашуча павесьці барацьбу за недадкладнае іх выпраўленьне. Хуткае і бальшавіцкае прызнаньне і выпраўленьне памылак патрабуе ўзмацненьня бальшавіцкай самакрытыкі, разгортваючы якую ўсе арганізацыі КП(б)Б будуць выхоўваць свае рады, будуць бальшавіцкімі тэмпамі рухацца ўперад.

11. Партыя і ЦК будуць рашучы адпор тым праваапартуністычным і «лева»-апартуністычным элементам, якія імкнуцца і будуць імкнуцца выступаць супроць генэральнай лініі партыі, супроць ленінскага ЦК УсеКП(б). Усякім антыпартыйным спробам, накіраваным на дыскрэдытацыі кіраўніцтва партыі КП(б)Б дасьць руйнуючы бальшавіцкі адпор.

У адносінах усіх тых, што супраціўляцца выпраўленьню памылак і перагібаў, усіх тых, [illegible] затрымліваюць разгортваньне бальшавіцкай самакрытыкі, партыя [illegible] прымаць рашучыя [illegible] да выключэньня з партыі, [illegible] пастановы сакавіцкага пленуму ЦК КП(б)Б.

Спробы [illegible] толькі тым, [illegible] хістаньні, [illegible] знаходзіцца [illegible] усе гэтыя спробы [illegible] самы рашучы адпор [illegible] ЦК КП(б)Б.

12. Галоўная небясьпека на даным этапе застаецца і надалей правая небясьпека. Партыя [illegible] мабілізаваць усе свае сілы на барацьбу са спробамі праваапартуністычных элементаў узьнять голаву, скарыстаць скрыўленьні партыйнай лініі для барацьбы з генэральнай лініяй партыі, пад выглядам мнімай барацьбы з «левымі» загібамі.

Партыя будзе біць [illegible] усёй бальшавіцкай непрымірымасьцю на ўсіх пашчных крыках і іншых тэорыях аб «самацёчным» разьвіцьці калгаснага руху. З асаблівай рэзкасьцю і рашучасьцю необходна [illegible] барацьбу супроць спроб апартуністычных элементаў пралезьці ў нашу барацьбу з перагібамі, [illegible] не ад правадзіцьня нашай палітыкі сацыялістычнай перабудовы вёскі.

Даючы адпор на два фронты—правым апартуністым, «левым» перагібчыкам і прыхільнікам адносінам да іх, КП(б)Б будзе ў першы [illegible] радох рашучай барацьбы за генэральную лінію партыі, за ленінскую палітыку ЦК УсеКП(б).

Новы дакумант Леніна

7 красавіка 1919 г. («Правда», № 76, ад 9 красавіка 1919 г.), было атрымана радыё ад Баварскай рэспублікі, адрасаванае Расійскай Савецкай рэспубліцы, Леніну, у Маскву з паведамленьнем аб захопе ўлады пралетарыятам Баварыі, з прывітаньнем Расійскай і Вэнгерскай савецкім рэспублікам, як сваім натуральным саюзьнікам у барацьбе за вызваленьне пралетарыяту ад ярма капіталу.

Дакумант Ул. І. Леніна, які друкуецца ніжэй, зьяўляецца прывітаньнем адказам баварцам. Арыгінал рукапісу Ул. Ільіча Леніна захоўваецца у архіве Інстытуту Леніна.

ІНСТЫТУТ ЛЕНІНА.

ПРЫВІТАНЬНЕ БАВАРСКАЙ САВЕЦКАЙ РЭСПУБЛІЦЫ

Дзякуем за прывітаньне і з свайго боку вітаем Савецкую рэспубліку Баварыі ад усёй душы. Вельмі просім вас паведамляць больш часта і канкрэтна, якія меры вы правялі для барацьбы з буржуазнымі катамі Шэйдэманамі і К-о, ці стварылі саветы рабочых і прыслугі па вучастках гораду, ці ўзброілі рабочых, ці разброілі буржуазію, ці выкарысталі склады вопратки і інш. прадуктаў для неадкладнай і шырокай дапамогі рабочым, асабліва батраком і дробным сялянам, ці экспрапрывалі фабрыкі і багацьці капіталістых у Мюнхэне, а таксама капіталістычныя зямляробчыя гаспадаркі ў яго ваколіцах, ці адмянілі гіпатэкі і арэндную плату для дробных сялян, ці падвоілі або патроілі плату батраком і чорнарабочым, ці канфіскавалі ўсю паперу і ўсе друкарні для друкаваньня папулярных лістовак і газэт для масы, ці ўвялі 6-гадзін. рабочы дзень з 2 або 3 гадзінныміі заняткамі па кіраўніцтве дзяржаваю, ці ўшчыльнілі буржуазію ў Мюнхэне для неадкладнага ўсялення рабочых у багатыя кватэры, ці ўзялі ў свае рукі ўсе банкі, ці ўзялі заложнікаў з буржуазіі, ці ўвялі больш высокі харчавы паёк для рабочых, чым для буржуазіі, ці мабілізавалі рабочых пагалоўна для абароны і для ідэйвай прапаганды ў ваколічных вёсках. Самае сьпешнае і шырокае правядзеньне гэтакіх і падобных мер пры самадзейнасьці рабочых, батрацтва, а разам з тым і дробна-сялянскіх саветаў павінна замацаваць ваша становішча. Необходна абмежасьці буржуазію надзвычайным падаткам і даць рабочым, батраком і дробным сялянам адразу і ва што-б там ні стала фактычнае палепшэньне іх становішча.

Найлепшыя прывітаньні і пажаданьні посьпеху.

ЛЕНІН.

Аб спробах дыскрэдытаваць лінію партыі аб уменьні прызнаваць памылкі

(З ПЕРАДАВОЙ «ПРАВДЫ»)

Перагібы, якія мелі месца ў калгасным будаўніцтве, могуць не натхнуць усіх ухіліст[illegible] Выпрабаваныя паўных справа і зьлева. —яны стараюцца ці ў мутнай вадзіцы дыскрэдытаваць генэральную лінію партыі. Іменна да гэтага [illegible] бокадумныя заявы [illegible] правых аб тым, што жыцьцё апраўдала іх прагнозы. Але вялізны аўтарытэт ленінскага ЦК, каб можна было проста[illegible] весьці на яго атаку. Вось чаму ў больш[illegible] бач, зразумела, [illegible] мі) выбіраюцца [illegible] спрытнай крывадушнай маскіроўкі. Адкрытым выступленьні замяняюцца шаптаньнем «з-за вугла», бальшавіцкая крытыка ў руках [illegible] ных шаптуноў [illegible] вай абываталькае [illegible] мае вельмі выразнае мэтавае заданьне: зрабіць вінаўнікам усіх перагібаў генэральную лінію партыі.

У Бежацкай акрузе мы мелі вельмі цікавы выпадак, [illegible] сулакейвала мясцовых работнікаў, зьня тых з работы за перагібы словамі: «вы тут рэбята ні пры чым. Масква вам гаварыла так рабіць, цяпер вы-жа павінны расплачвацца». Гэту кулацкую формулу ў розных вопратках глыбока - тэарытычных артыкулаў меншавіцкіх, абы[illegible] ваньняў дамарошных правых і «левых» вельмі старанна прабуюць прыпаднасіць масе. У некаторых ячэйках мелі месца выступленьні, у якіх рабіліся спробы «высясьці» з генэральнай лініі партыі законамернасьць такіх падмылак, як спробы безадказнага ліквідацыі гарадзкой буржуазіі, узятых ў радзе месц «гуранных» тэмпаў калектывізацыі. У такога роду спробах яўна праглядваюць доўгія вушы прымірэнцтва да правых і «левых» апартуністых. Але спасылаючыся на тую-жа генэральную лінію, прабуюць яны «протаскивать» правыя ўстаноўкі (неабходнасьць згортваньня пёзунгу суцэльнай калектывізацыі). Нярэдка атрымліваецца на першы погляд дзіўнае відовішча: клянуцца генэральнай лініяй, аглушаючы акружаючых гэтымі клятвамі, і прабуюць «протаскивать» правыя і «левыя» ідэйкі.

Вялізарнейшым пасьведчаньнем ленінскай магутнасьці партыі служыць тое, што ўсім такім спробам даецца самы энэргічны адпор. Гэты адпор трэба ўзмацніць, шырока разгортваючы бальшавіцкую самакрытыку, памятуючы зноў-такі, што пад сьцягам гэтай самакрытыкі могуць мець месца і спробы ганьбіць генэральную лінію. Так, матыўючы самакрытыкай, заядлыя «левакі» прабуюць аблыжна прышываць ярлычок правым да прахільнікаў генэральнай лініі. І «назадарст»: правыя трацяць шмат сілы, каб «олевачить», каб прышыць ярлычок «левы» да ўсіх тых, хто да канца абаранне генэральную лінію партыі. У тых і других спробах вельмі вырзна гучыць «одной лишь думы власть» — дыскрэдытаваць генэральную лінію партыі.

Генэральная лінія партыі атрымала цэлы рад перамог, іменна генэральная лінія дае сілу і мужнасьць для рашучага выпраўленьня ўсіх дапушчаных перагібаў. Ад генэральнай лініі партыі адступаюць тыя таварышы, якія ня маюць мужнасьці поўным голасам сказаць аб сваіх памылках.

Было-б глупствам думаць, быццам поўнае прызнаньне сваёй віны абніжае аўтарытэт данага работніка ў вачох масы. «Рэбячеством» было-б лічыць, што можна якімі-небудзь «тэорыямі» замазаць свае памылкі. Нельга ўласную «качку» генэральнай лініі прыпісваць хістаньням серадняка. Нельга памылкі цёмных прыпісваць несьвядомасьці масы. Усякага роду папавінчатасьць у справе прызнаньня сваіх памылак дзейнічае на руку прафсыянальным шаптунам справа і зьлева. Усякага роду апраўданьні сваіх памылак — аб'ектыўна ёсьць барацьба супроць генэральнай лініі партыі.

Грандыёзная дэманстрацыя рэвалюцыйнай моладзі ў Лейпцыгу

БЭРЛІН, 21. Як паведамляюць з Лейпцыгу, дэманстрацыя, якая адбылася там у зьвязку з «днём моладзі», выліўся ў небывалую яшчэ ў Нямеччыне на сваёй магутнасьці, грандыёзную маніфэстацыю рэвалюцыйнай моладзі. У дэманстрацыі брала ўдзел звыш 100.000 рабочых і работніц. Больш 30.000 маладых рабочых прыбылі ў Лейпцыг з усіх часьцей Нямеччыны цягніком і на 690 грузавіках. Паліцыя «левага» сацыял - фашысцкага паліцэй - прэзыдэнта Флейшэра трымала сябе вельмі выклікаюча. Калі дэманстранты выкінулі чырвоныя сьцягі, атрада паліцыі прабавалі адарваць сьцягі сілай, але былі адбіты дэманстрантамі і, ня гледзячы на пагрозы рэвальвэрамі, павінны былі адступіць.

На мітынгу выступалі з прамовамі старшыня ЦК камсамолу Мюлер, прадстаўнік Інтэрнацыяналу моладзі і прадстаўнікі ЦК кампартыі Нямеччыны Тэльман і Нэйман. У час прамоў паліцыя пачала крывавую расправу з рабочымі, адкрыўшы стральбу з рэвальвэраў. Адзін малады рабочы быў забіты стрэлам у жывот і трое рабочых паранены. Абураныя рабочыя кінуліся на паліцэйскіх, забілі паліцэйскага афіцэра—Градэ, яшчэ адлага паліцэйскага і экрамі таго параніді другога паліцэйскага.

Над асабістым кіраўніцтвам старшыні ЦК кампартыі Тэльмана, Рэмэле і Нэймана дэманстрацыя накіравалася ў рабочыя раёны гораду, багата ўпрыгожаныя чырвонымі сьцягамі. На ўсіх вуліцах рабочыя Лейпцыгу згуртаванымі радамі віталі дэманстрацыю з паднятым сьціснутым кулаком — баявым знакам рэвалюцыйнага пралетарыяту. Дэманстрацыя, якая зьлучылася галоўным пунктам дня моладзі, паказала глыбокую сувязь камсамола і кампартыі з масамі нямецкага пралетарыяту.

Калі апошнія ўдзельнікі выходзілі з плошчы, паліцыя зноў атакавала рабочых. Толькі дзякуючы ўмяшальнасьці іраўнікоў дэманстрантаў не пайдаліся на правакацыю. Сутычкі з паліцыяй працягваліся і сёньня. Узброеная карабінамі і штыкамі паліцыя заняла некалькі кварталаў, дзе спыняліся групы ўдзельнікаў з'езду. Усе вуліцы Лейпцыгу запаходзяцца пад ахоўнай паліцыі. На дарозе к Гальле паліцыя агляда́е ўсе аўтамабілі. Усе рабочыя, якія носяць значкі-пратэсту супроць забароны саюзу чырвоных франтавікоў, арыштаваны і адданы пад суд. У Лейпцыг прыбыла 25 грузавікоў з значнымі атрадамі паліцыі з іншых гарадоў Саксоніі.

Сёньня ў 12 гадз. дня ў Лейпцыгу абвешчана так званае «малы стан аблогі», пры якім забаронены ўсякія сходы. (ТАСС).

Вялізарная дэманстрацыя пратэсту ў Вільні супроць расправы фашызму ў Заходняй Беларусі

ВІЛЬНЯ, 21. Учора ў Вільні, калі віленская паліцыя перавозіла арыштаваных у часе апошніх масавых арыштаў з будынку цэнтральнага арышту дэфэнзывы ў Лукіскую турму, каля будынку цэнтральнага арышту, на вул. Ігната, сабралася вельмі многа рабочых.

Рабочыя наладзілі баявую дэманстрацыю пратэсту супроць масавых распраў фашызму ў Заходняй Беларусі. Кідаліся лёзунгі супроць фашысцкай дыктатуры і фашысцкага тэрору, за дыктатуру пралетарыяту і інш.

Нават віленскі фашысцкі друк прымушаны прызнаць, што ў дэманстрацыі прымаў удзел надзвычайна вялікі лік рабочых, нават у параўнаньні з апошнімі дэманстрацыямі віленскага пралетарыяту.

Паліцыя, моцна запахоханая рэвалюцыйнай рабочай дэманстрацыяй, павялічыла ахову арыштаваных больш чым у чатыры разы, і паставіла каля кожнага арыштаванага ўзброенага да зубоў паліцэйскага.

Клясавыя баі ў краёх капіталу

ЗАБАСТОЎКА 11.000 РАБОЧЫХ ТРАМВАЮ Ў ТОКІЁ

ТОКІЁ, 20. Забастоўка рабочых гарадзкога трамваю ў Токіё працягваецца. У забастоўцы прымае ўдзел каля 11.000 рабочых. Такійскі саюз рабочых муніцыпальнага транспарту, які налічвае 11.000 членаў яшчэ тыдзень таму назад прадаўжаў муніцыпалітэту паступовыя патрабаваньні: ня зьніжаць штогодна премі, якая выдаецца; адмовіцца ад запрапанаванага скарачэньня ліку рабочых і дацьгарантыю ў тым, што ў будучым зарпдата ня будзе зьніжана. Муніцыпалітэт адхіліў гэтыя патрабаваньні.

РЭПРЭСІІ СУПРОЦЬ ЗАБАСТОЎШЧЫКАЎ

ТОКІЁ, 21. Забастоўка такійскіх транспартнікаў, якая ахапіла 98 проц. усіх рабочых і служачых трамвайных і аўтобусных эксплоцыі, працягваецца. Рух трамваяў і аўтабусаў падтрымліваецца ў палавінным разьмерах сіламі штрэйкбрэхераў. Учора муніцыпалітэт звольніў 26 кіруючых дзеячоў саюзу транспартнікаў. Паводле вестак прэсы, паліцыяй арыштавана каля 50 кіраўнікоў забастоўкі ў розных пунктах гораду на падставе паліцэйскіх правіл «аб ахове публічнага спакою». 30 чалавек арыштавана за спробу зьняць з работы рабочых цэнтральнай электрастанцыі Кінгуава. Улады зьмоцнена шукаюць членаў забастовачнага камітэту. (ТАСС).

ПРАЦЭС 32 РАБОЧЫХ Ў КІШЫНЕВЕ

ВЕНА, 16. Як падаюць з Кішынева, 11-га красавіка там пачалося слуханьне справы камітэту рабоча-сялянскага блёку, арыштаваных у сьнежні мінулага году, у сувязі з масавай дэманстрацыяй на вуліцах Кішынева. Падсудных 32 чалавекі. Сярод іх кіраўнічыя работнікі рабоча-сялянскага блёку і унітарных прафсаюзаў. (ТАСС).

У АГНІ ЗАГІНУЛА ЗВЫШ 100 ЧАЛАВЕК

ВЕНА, 20. Як падаюць з Румыніі, у Констэнце, учора над вялікдзень згарэла царква. У агні загінула звыш 100 чал.

ПРЫСУД НАД 8 ПОЛЬСКІМІ ДЭЛЕГАТАМІ МІЖНАРОДНАГА СЯЛЯНСКАГА КАНГРЭСУ

ВАРШАВА, 16. Адбыўся суд над 8-мю польскімі дэлегатамі міжнароднага сялянскага кангрэсу ў Бэрліне. За нелегальны пераход польска-нямецкай граніцы дэлегаты прыгавораны да 2-хтыднёвага арышту і да штрафу ў 300 злотых кожны. (ТАСС).

РЭФАРМІСТЫЯ САРВАЛІ ЗАБАСТОЎКУ МЭТАЛІСТЫХ У КАПЭНГАГЭНЕ

СТАКГОЛЬМ, 16. Як паведамляюць з Даніі, рэфармісцкі прафсаюз сарваў забастоўку 3.000 рабочых мэталапрамысловасьці ў Капэнгагэне, якая пачалася тры тыдні. Пры галасаваньні па пытаньні аб працягу забастоўкі 2.276 галасоў было падана супроць спыненьня забастоўкі і толькі 152 галасы—за спыненьне. Тым ня менш, рэфармісцкі саюз наўпраўкі энэргічным пратэстам работніц, абвясьціў аб спыненьні забастоўкі, пагрозіўшы, што данамога з забастовачнага фонду выдаватцца ня будзе. (ТАСС).

РАССТРЭЛ БЕЗЗАБАРОННЫХ ЖАНЧЫН ЧЭХА-СЛАВАЦКАЙ ЖАНДРМЭРЫЯЙ

ПРАГА, 20. Мясцовая арганізацыя чэха-славацкай кампартыі скіравала ў рабочым прыгарадзе Прагі рабочы масавы мітынг. Мясцовая улада забараніла мітынг. Тым ня менш, у назначаную гадзіну на зборны пункт сьвялася шмат рабочых. Прыбыўшая жандармэрыя перападжала адкрыцьцё мітынгу. Адбыліся сутычкі. Прысутныя, сярод якіх было шмат жанчын, аказалі супраціўленьне жандармэрыі. Жандары адкрылі страляніну на безабаронных жанчынах. 5 жанчын паранена, з іх 2—цяжка.

Леніпскі заклік у КП(б)Б

Узмоцнім палітычнае выхаваньне новага папаўненьня

АДНА З АСНОЎНЫХ БАЯВЫХ ЗАДАЧ

У ленінскія дні перадавыя кадры рабочае клясы папоўнілі рады бальшавіцкай партыі. На заводах і фабрыках цэлыя цэхі падалі калектыўныя заявы аб уступленьні ў рады УсесКП(б). Масавае ўступленьне перадавых пралетараў у рады партыі выразна сьведчыць аб тым, наколькі з кожным днём узрастае аўтарытэт партыі сярод шырокіх рабочых, батрацкіх і бяднацка-серадняцкіх мас.

Зараз задача партыйных арганізацый заключаецца ў тым, каб паладзіць пастаяннае і глыбокае палітычнае выхаваньне камуністых ленінскага закліку. Партыйныя арганізацыі павінны выхаваць новыя кадры бальшавікоў у духу непрымірымай барацьбы на два фронты, як з правым апартунізмам — галоўнай небясьпекай, так і «левым» апартунізмам за генэральную лінію партыі. Палітычнае выхаваньне камуністых ленінскага закліку, уцягненьне іх у актыўную штодзенную работу, узбраеньне іх рэвалюцыйнай тэорыяй — зьяўляюцца асноўнымі задачамі кожнай партарганізацыі. Сёньня ў сувязі з 60-годзьдзем са дня нараджэньня Ўладзімера Ільліча Леніна, як ніколі, варта ўспамянуць, якую вялізарную ролю адводзіў ён палітычнаму выхаваньню партыйных мас. Уладзімер Ільліч увесь час падкрэсьліваў вялікае значэньне тэарытычнай вучобы і патрэбу штодзённа і сыстэматычна павышаць свой тэарытычны ўзровень.

У асноўным партарганізацыі дабіліся бясспрэчных посьпехаў на палітычным выхаваньні новых кандыдацтычным выхаваньні новых кандыдацкіх мас. У Менску, Гомелі і г. д. на заводах і фабрыках створаны палітшкоўлы і палітгурткі, у якіх партыйцы і лепінскага закліку прапрацоўваюць і вывучаюць асноўныя пытаньні палітыкі партыі. Значная частка новых кандыдатаў уцягнута ў сетку райпартшкол.

Раённыя камітэты партыі стварылі спацыяльныя сэктары, якія штодзенна кіруюць работай на палітычным выхаваньні камуністых лензакліку. На гэтых посьпехах, зразумела, цельга ні ў якім разе супакоіцца. Кожная партыйная арганізацыя павінна яшчэ больш узхапіць сваю работу па выхаваньні новых кандыдацкіх мас, на павышэньні іх тэарытычнага ўзроўню, на ўцягненьні іх у штодзенную партыйную і масавую работу. Т. П.

РАСЬЦЕМ

Залінейная партарганізацыя за апошнія месяцы прыняла ў свае рады каля **400** рабочых і работніц ад варштату. У асноўным рост ішоў за лік перадавых пралетараў, якія маюць вялікі вытворчы стаж і прымаюць актыўны ўдзел у грамадзкай рабоце. У рады партарганізацыі ідуць старыя кадравыя рабочыя, якія працуюць на заводах і фабрыках Залінейнага раёну. Аб гэтым добра сьведчаць наступныя лічбы:

З прынятых за апошнія тры кварталы рабочых і работніц каля 25 проц. маюць вытворчы стаж звыш 15 год. 30 проц. усіх прынятых рабочых і работніц маюць 10-гадовы вытворчы стаж; 16 проц. — маюць 15-цігадовы вытворчы стаж і г. д.

56 проц. рабочых і работніц, прынятых у рады партарганізацыі, прымаюць актыўны ўдзел у грамадзкай рабоце. 40 проц. прынятых рабочых хаваюць палітычную асьвету. Асноўная маса камуністых ленінскага закліку прымае самы актыўны ўдзел ва ўдарных брыгадах. Зараз партыйная арганізацыя арганізавала сетку партшкол і палітгурткоў для палітычнага выхаваньня партыйцаў закліку 1930 г.

М—н.

Выкрашэньнем задач культурнай рэвалюцыі ажыцьцявім адзін з важнейшых наказаў правадыра

Ліквідацыю няпісьменнасьці—на баявыя тэмпы

ЦК УсесКП(б) і ЦК КП(б)Б паставілі асноўнай задачай дабіцьця «рашучага пералому ў далейшай рабоце па ліквідацыі няпісьменнасьці, карэннай перабудовы ўсёй сыстэмы работы на падставе вышкаў здабытага вопыту і плянавернай арганізацыі ўсёй работы на ліквідацыі няпісьменнасьці, на аснове адзінага пляну абліцьнаньня сіл і сродкаў шырокай грамадзкасьці, усіх арганізацый, якія прымаюць удзел у ліквідацыі няпісьменнасьці. Узмоцніць тэмп ліквідацыі няпісьменнасьці, ахапляючы ў першую чаргу ў горадзе індустрыяльных рабочых і новыя колы пралетарыяту, у вёсцы — батракоў, рабочых саўгасаў, сэзонькіраў, членаў калгасаў і бяднякоў».

У якасьці практычнай задачы пастаўлена ліквідаваць няпісьменнасьць індустрыяльных рабочых, членаў прафсаюзаў, батрацтва, сярод рабочых саўгасаў, калгасьнікаў — у 1930 г. і сярод іншага працоўнага насельніцтва ў 1931-1932 г.

Выкананьне пастаўленай задачы ў БССР патрабуе за тры гады ліквідаваць няпісьменнасьць сярод толькі актыўнай часткі насельніцтва ва ўзросьце ад 12 да 35 год—685.170 чалавек; а калі ўзяць рабочых і калгасьнікаў ва ўзросьце вышэй 35 год (а мы бязумоўна павінны ахапіць іх прыблізна да 45-50 гадоў), дык гэтая лічба ўзрастае да 850-900 тыс. чалавек.

Плян ліквідацыі няпісьменнасьці, якраз, і выходзіць з гэтай устаноўкі. На пляне 1930 г. вызначана ліквідаваць няпісьменнасьць сярод 280.490 чалавек, або ў 4 разы больш, чым у мінулым годзе. Пры чым выкананьне яго 40 проц. ускладзены выключна на сродкі і сілы грамадзкасьці.

Лічбы паказваюць, што за выключэньнем Менскай акругі, якая значна перавысіла плянавыя меркаваньні, усе іншыя акругі ня выканалі сваіх заданьняў. Магілёўская, Гомельская і, асабліва, Полацкая і Мазырская акругі ганебна цягнуцца ў хвасьце—гэтай вялікай справы.

Яшчэ горш стаіць справа ў галіне ахопу ўдарных груп, рабочых, членаў саюзу, батракоў, калгасьнікаў. Паводле матар'ялаў у паказаных вышэй 5 акругах, мы маем зусім нікоўны ахоп ліквідацыяй няпісьменнасьці рабочых, які складае 8.095, зусім малы лік батракоў—усяго 9.322, а таксама калгасьнікаў—усяго 7.245 чалавек.

Факты і матар'ялы з месц сьведчаць, што на некаторых буйных прадпрыемствах (Бярэзіна, Домбаль, Дзьвіна) ахоплена і навучаецца ў школах і лікпунктах толькі 40-50 проц. няпісьменных. У некаторых раёнах вельмі мала, а ў асобных лікпунктах—зусім няма батракоў. У той час, як у лікпунктах навучаецца значная частка кулакоў, гандляроў, індывідуальна абкладзеных. У Баброўскай акрузе навучаецца ў лікпунктах 1020 чал. чужакоў, у Гомельскай—339 чал., у Магілёўскай—260 чал. Прыведзеныя факты і лічбы сьведчаць аб тым, што ў гэтай рабоце на месцох мы маем наяўнае скрыўленьне клясавай лініі, што пізавыя партарганізацыі (райкомы, ячэйкі) зусім слаба і несваячасова рэагуюць на такія зьявішчы.

Трэба выкаваць дырэктыву партыі, у 1930 годзе ахапіць ліквідацыяй няпісьменнасьці, рабочых, членаў саюзу, батракоў, рабочых саўгасаў, калгасьнікаў. Трэба не дапусьціць ніякіх перабояў у рабоце ні ў адным пункце. Асноўнае, што трэба для работы ў лікпунктах і ў школах—гэта шырокае разгортваньне грамадзкай палітычнай і культмасавай работы.

У некаторых акругах мы маем першыя крокі ў гэтым напрамку. У Гомелі вызначаны спэцыяльны культдзень для грамадзка - палітычнага выхаваньня і культурна-масавай работы. Вызначаецца культдзень у Бабруйску і ў Менску. У Бабруйску Агітпрофам АК КП(б)Б вылучаны каля 60 партыйцаў, якія прымацаваны да лікпунктаў і школ, каб праводзіць там грамадзка - палітычную работу.

Аднак, гэты вопыт надавычай слаба папулярызуецца.

Зараз пытаньне калектывізацыі, правядзеньне весьнавой пасеўнай кампаніі, выкананьне прамфінпляну — павінна быць стрыжанем усёй работы лікпунктаў і школ. Трэба разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва памж школамі і лікпунктамі, ячэйкамі «ПН», па ўсёй працы па ліквідацыі няпісьменнасьці. Трэба пераключыць работу ліквідацыі няпісьменнасьці на клясавую палітычную аснову, на баявыя тэмпы работы.

ХВ. СЬЦЕПАНЮК.

Падрыхтоўка кадраў—цэнтральная задача

XV партыйны зьезд і асабліва лістападаўскі пленум ЦК УсесКП(б) паставілі ва ўсю шырыню перад партыяй пытаньне аб кадрах.

Асабліва востра гэта праблема стаіць у нас, у Савецкай Беларусі. Гэта падкрэсьлілі ў сваіх пастановах вярасьлеўскі і студзеньскі пленумы ЦК КП(б)Б.

Толькі правыя апартуністы не дапускаюць рашаючага значэньня праблемы кадраў. Гэта недапусканка вынікае з іх агульнай апартуністычнай установкі. «Апартуністычная пяленінская ўстаноўка правых ухілістых, якія не разумеюць усёй важнасьці і вострасьці праблемы кадраў і замазваюць задачу фарсаваньня падрыхтоўкі новых кадраў пралетарскіх спэцыялістых, вынікае проста з апартуністычнай тэорыі правых і іх установкі на згортваньне тэмпу індустрыялізацыі і калектывізацыі» (з рэзалюцыі студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б аб кадрах).

КП(б)Б дае рашучы адпор правым апартуністым. КП(б)Б ужывае ўсе сродкі і энэргію для выкананьня гэтага пытаньня.

У Беларусі нам да канца пяцігодкі патрэбна падрыхтаваць толькі ў галіне с.-г. і прамысловасьці спэцыялістых з вышэйшай кваліфікацыяй 18.000 чал., з сярэдняй — 25.000 чал., а гэта толькі па самых мінімальных меркаваньнях, і тады мы забясьпечым спэцыялістымі прамысловасьць і сельскую гаспадарку Беларусі прыблізна толькі на 80 проц.

Характэрнымі зьяўляюцца тыя сродкі, якія вызначаюцца на падрыхтоўку кадраў. Да канца пяцігодкі на гэтую мету прыдзецца выдатковаць 130 мільёнаў руб., а толькі ў адным наступным годзе — 37 мільёнаў руб. Каб уявіць сабе ўсю вялізарнасьць гэтай лічбы, варта ўспомніць, што ўвесь бюджэт Наркамасьветы ў гэтым годзе складае 18 мільёнаў руб. А зараз мы толькі ў адным наступным годзе і толькі ў двух галінах народнай гаспадаркі вызначаем 37 мільёнаў руб. Вось гэта лепш за ўсё гаворыць аб намаганьнях, якія партыя прыкладзе для выкананьня гэтага пытаньня.

Адным з асноўных пытаньняў зьяўляецца арганізацыя тых новых навучальных устаноў, тэхнікумаў, ВНУ і курсаў, якія вызначаны пяцігодовым плянам. Паводле меркаваньняў, трэба будзе адкрыць 8 новых с.-г. тэхнікумаў, адну ВТНУ, якая пачне будавацца ў БССР у наступным годзе, у якой першы прыём разлічаны на 780 чал. У Беларусі былі толькі два політэхнікумы. У гэтым годзе будзе адкрыта яшчэ 7 дзённых і 6 вячэрніх індустрыяльных тэхнікумаў.

Акрамя гэтага будзе арганізаваны пяць рад кароткатэрміновых курсаў для перападрыхтоўкі практыкаў-спэцыялістых, якіх мы выпусьцім з гэтых курсаў тэхнікамі і інжынэрамі.

Трэба канстатаваць, што ненармальная арганізацыя нашых навучальных устаноў яшчэ не адпавядае тым задачам, якія перад імі стаяць. Асабліва паказальным зьяўляецца становішча, якое існавала да пядзьнітэ часу і яшчэ існуе дзе-ні-дзе да гэтага часу) у галіне с-г. асьветы. Сельска-гаспадарчая асьвета была так пабудавана, што яна рыхтавала спэцыялістых но для калектыўных гаспадарак, не для сацыялістычнага земляробства, а для індывідуальнай сельскай гаспадаркі. Невыпадкова і недарма Горацкі раён, у якім знаходзіцца вышэйшы штаб сельска-гаспадарчай асьветы быў першым раёнам у БССР... па адвядзеньні на хутары. 80 проц. усіх сялянскіх гаспадарак было там падзелена ў хутары. А што найбольш важна, 40 проц. было пераведзена на хутары за час савецкай улады. Да 1929 году там ни было ні аднаго калгасу.

Ці гэта не зьяўляецца характэрным для зьместу работы тае ўстановы, якая паліна была выхоўваць камандзіраў сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі?

Важнейшай задачай зьяўляецца выкананьне дырэктыў лістападаўскага пленуму ЦК УсесКП(б). Дасюль гэтыя дырэктывы выконваюцца зусім і зусім слаба.

Працоўная дысцыпліна зусім не на належнай вышыні. Ёсьць значная частка студэнтаў, якая ня толькі ня лічыць патрэбным, але лічыць «нізкай сваёй годнасьці» наведваць лекцыі і сэмінары на універсытэце і г. д. Падобныя адносіны трэба каленным жалезам выжыць са сьцен савецкіх навучальных устаноў.

Працоўная дысцыпліна ва універсытэце, у тэхнікуме, рабфаку і г. д. павінна быць пастаўлена так, як і на заводзе, на фабрыцы. З студэнтамі, у якіх назіраюцца падобныя адносіны да заняткаў, трэба абыходзіцца так, як адносіцца да злоснага прагульшчыка на заводзе і фабрыцы.

Трэба таксама падкрэсьліць значэньне адзінаначальня ў сьценах навучальных устаноў.

Праблема кадраў зьяўляецца палітычнай праблемай, клясавай праблемай, а ня толькі праблемай арганізацыі або тэхнікі. На выкананьне яе трэба мабілізаваць увагу ўсяе нашай партыі, усяе рабочае клясы.

Р.

Нашы ворагі аб Ленінскай пяцігодцы*)

Ленін ня раз зазначаў на глыбокае міжнароднае значэньне Кастрычніцкай рэвалюцыі. У брашуры «Пралетарская рэвалюцыя і рэнэгат Каўцкі», Ленін падкрэсьліваў, што бальшавікі здолеў папулярызаваць ідэю дыктатуры пралетарыяту ва ўсім сьвеце, што гэтыя лацінскія словы бальшавікі пераклаў спачатку на расійскую, а пасьля на ўсе мовы сьвету». У першы год пасьля Кастрычніка, Ленін гаварыў аб тым вялікім гістарычным факце, што мільёны рабочых і селян пачалі «практычнае ажыцьцяўленьне сацыялізму». Калі мы разьбілі клясавых ворагаў у адкрытай узброенай барацьбе і перайшлі да мірнага будаўніцтва—увесь буржуазны сьвет лічыў, што на гэтай справе мы нямінучы зломім сабе шыі.

Але перамогшы вялізарнейшыя труднасьці, мы ня толькі адбудавалі разбураную гаспадарку, але і перайшлі да поўнае рэканструкцыі нашае гаспадаркі, прыступілі да непасрэднага будаўніцтва сацыялізму. Наш пяцігадовы плян, у асобную якога пакладзены **ленінскія паказаньні** аб шляхох нашага разьвіцьця, ня толькі цалкам выконваецца шырокімі масамі працоўных Савецкага Саюзу, але і пакідаецца ў сваіх меркаваньнях далёка ззаду.

І так, як бальшавізм адолеў зрабіць ідэю савецкай ідэяй усяго міжнароднага пралетарыяту, усіх прыгнечаных сьвету, так цяпер ідэя будаўніцтва сацыялізму, ідэя нашага першага ленінскага пяцігадовага пляну зьяўляецца сьцягам міжнародная рэвалюцыі. За нашу пяцігодку змагаюцца ня толькі рабочыя і сяляне Савецкага Саюзу, але і пралетары Бэрліна, Варшавы, Дэтройта, Бамбэі, працоўныя Кітаю, Эсіпту і Індыі.

Перамоглае ажыцьцяўленьне пяцігодкі выклікае зусім зразумелае шаленства нашых ворагаў і ўзмацненьне з іх боку падрыхтоўкі вайны, якая павінна была-б задушыць наш край—край пабудовы сацыялізму. І калі раней увесь буржуазны сьвет адносіўся да нашай пяцігодкі як да плоду чарговых фантазый бальшавікоў, дык цяпер чутны зусім іншыя галасы, іншыя тоны.

Буржуазія, у сваім родзе, уверавала у рэальнасьць нашай пяцігодкі, іменна таму яна так ліхаманкава рыхтуе свае сілы да находу супроць нас. Надзвычай цікава прыслухацца да таго новага, што мы адначаем у ацэнцы нашых пляноў з боку прадстаўнікоў буржуазнага сьвету. Ангельская газэта «Фінэнсыэль Ньюс» у спэцыяльнай перадавіцы, прысьвечанай нашай пяцігодцы, піша, што

«ідэя пяцігадовага пляну можа прывесьці да зьдзіўленьня англічанна. Пяцігодка—гэта поўны пераварот на ўсёй эканамічнай сыстэме, да якой прывык Захад».

Аб гэтым «перавароце» поўнымі старонкі ўсяе буржуазнае прэсы. Аб гэтым «перавароце» са страхам у голасе пішуць цэлыя досьледы буйныя палітычныя і эканамічныя органы буржуазіі. Зразумела, як заўсёды на гэтай справе ўзводзяцца ўсемагчымыя бязглуздыя выдумкі, але аднаго факту вораг ня можа адмаўляць—гэта рэальнасьці і сілы нашага пяцігадовага пляну. Буйная амэрыканская газэта «Нью-Ёрк-Таймс» піша:

«Больш чым можна было меркаваць год таму назад, Савецкая Расія пасунулася ў выкананьні вялізарнейшага ў гісторыі эканамічнага будаўніцтва. Пяцігадовы плян павінен пераварацьць зямляробчы край са 150 мільёнамі насельніцтва ў край пераважна індустрыяльны».

І далей гэта-ж газэта адзначае:

«Плян пастаўлены паражаючы, што яго вялізарная эканамічная сутнасьць адыходзіць на задні плян, у параўнаньні з псыхалёгічным эфэктам яго. Паражае сьмеласьць і рашучасьць, з якою гэтыя людзі, без дапамогі звонку, праводзяць гэту вялізарную справу».

У нашым савецкім краі працуе пямяла замежных спэцыялістых, у тым ліку і амэрыканскіх інжынэраў. Іх непасрэдныя назіраньні за нашым будаўніцтвам прадстаўляюць асаблівую цікавасьць. І гэтыя назіраньні знайшлі вясьць. І гэтыя назіраньні знайшлі месца ў радзе артыкулаў, зьмешчаных у адным з салідных амэрыканскіх часопісаў, якая піша:

«Амэрыканскія інжынэры назіраюць стварэньне вялізарных прадпрыемстваў, якія будуюцца на базе матар'яльных рэсурсаў, быць можа, больш багатых, чым тыя, якімі ўладаюць Злучаныя Штаты... Сацыялістычная дзяржава эканамічна мацнее з кожным днём. Трываласьць яе засьпавана на спачуваньні народу... Амэрыканскія інжынэры, захопленыя грандыёзнасьцю праектуемых прадпрыемстваў, працуюць ня толькі за грошы, іх ня «смущает» той факт, што яны твораць лёс нацыі, якая па добрабыце будзе супэрнічаць са Злучанымі Штатамі».

І рад амэрыканскіх газэт з вялікай трывогай прымушаны прызнаць, што тэмпы росту нашага Саюзу становяцца цітражаючымі для будучыні Амэрыкі, для яе манапольнага становішча. Амэрыка ўступіла ў перыяд вялікага эканамічнага крызісу. Самы магутны да гэтага часу край сусьветнага капіталу—Амэрыка, наперакор праваапартуністычным тэорыям аб «амэрыканскай выключнасьці», аб арганізаваным капіталізьме надпадае пад глыбокія эканамічныя страсьніі ўсёй сваёй сыстэмы. І вось на гэтым фоне—фоне амэрыканскага крызісу, з асаблівай сілаю выступае рост зусім супроцьлеглай сацыяльнай сыстэмы—рост нашага сацыялістычнага будаўніцтва. Амэрыканскія газэты ўдзяляюць вялікую ўвагу Савецкаму Саюзу і ўсе часьцей прымушаны прызнаваць, што СССР у адзнаку ад Амэрыкі, наўхільна ідзе наперад і разгортвае сваю сацыялістычную гаспадарку. Газэта «Нью-Ёрк Геральд Трыбюн» піша:

«Містэр Гувэр у сучасны момант зварачаецца тэлеграфна да ўсіх кіраўнікоў прамысловасьці, каб распачаць праводзіць тое, што рускія даўно ўжо ажыцьцяўляюць... Рускія праводзяць у жыцьцё тыя ідэалы, аб якіх марылі найвялікшыя ў сьвеце філёсофы, г. зн. стварыць людзкое шчасьце на матар'яльнай базе. А між тым, у хваленых Злучаных Штатах расьце беспрацоўе і заработак рабочага адстае ад патрэбнага пракітычнага мінімуму. Мы пустасловілі, а рускія ўсур'ёз заняліся зьнішчэньнем галечы, беспрацоўя і эканамічнай няўпэўненасьці адносна будучыні».

Але ня толькі амэрыканская прэса з вялікай увагай сочыць за нашым будаўніцтвам і вывучае нашу пяцігодку. Французкія газэты, якія б'юць рэкорд па сіле і актыўнасьці антысавецкай кампаніі, адначасова прымушаны гаварыць аб пяцігодцы і канстатаваць усю яе рэальнасьць. Відомы нафтавы спэцыялісты дэ-Булард піша ў найбольш яскравым антысавецкім органе французкай ціяжкой прамысловасьці:

«Ад старой прамысловасьці (мова ідзе аб Савецкім Саюзе—**Эм.**) амаль нічога не засталося. Усюды — вялізарная мэханізацыя, прыстасаваньне электрычнасьці ў шырокіх маштабах. Нафтаачышчальныя заводы працуюць на новым абсталяваньні, якое прадстаўляе сабой апошняе слова тэхнікі».

Разгортваньне нашай сацыялістычнай гаспадаркі, без якой-бы ні было дапамогі з боку, разьбівае ўсе надзеі ворагаў на тое, што мы будзем капітуляваць перад міжнародным капіталам, што мы ператвармся ў буржуазна-капіталістычны край. Зразумела, што ўсе гэтыя вымушаныя прызнаньні нашых ворагаў зьяўляюцца толькі паказальнікамі росту нашакоў ў іх лягеры перад абліччам пасьляховага выкананьня нашай пяцігодкі і актыўнай падрыхтоўкі да ўзброенай барацьбы супроць нас. Няма патрэбы даводзіць, што такія прызнаньні, як прызнаньне буржуазнага нямецкага прафэсара Шлёзінгера, які зрабіў даклад аб сваіх уражаньнях аб СССР на сходзе бэрлінскіх інжынэраў, павінны вельмі непакоіць нямецкую і ўсю сусьветную буржуазію. Гэты прафэсар гаварыў паступнае аб нашым Саюзе:

«У СССР панує выключна планавая гаспадарка. Тэхнічныя пляны СССР зьдзіўляючыя, грандыёзны і адзначаны поўнай сьвядомасьцю ў пастаноўцы мэты.

Індустрыялізацыя СССР у тэхнічных адносінах так прапрацавана, што калі пяцігодка будзе выканана, дык СССР праз дзесяць год будзе ўладаць лепшымі і найбольш добра абсталяванымі заводамі і фабрыкамі ва ўсім сьвеце. Плян калектывізацыі сельскае гаспадаркі гэніяльны і, калі Савецкаму Саюзу ўдасца выканаць вызначаную задачу павялічэньня вытворчасьці сельскае гаспадаркі, дык СССР будзе самым вялікім краем у сьвеце на

Апраўдваем МЫ ІМЯ ВЯЛІКАГА ПРАВАДЫРА

Пераклічка калгасаў і прадпрыемстваў імя У. І. Леніна

Мы спаткалі сяўбу падрыхтаванымі

Калгас „Ленінец"

ПРАЛОЙСК, Гомельскае акр. (Па тэлеграфу). Наш калгас, хаця і пададзены арганізаваны, але спаткаў ён сяўбу добра падкаваным. 33 проц. беднякоў і сераднякоў (63 двары) вёскі Ганшына, якія ўвайшлі ў калгас, у поўнай меры разумеюць тыя вялікія абавязкі, якія ўскладае на іх знаходжанне ў радах калектыўнае гаспадаркі, якая посіць высокую назву «Ленінец». Вось факты і лічбы, якія пацьвярджаюць, што нашы калгасьнікі апраўдваюць ганаровую і абавязваючую назву членаў калгасу «Ленінец».

Пасьля дэтальнай прапрацоўкі новага статуту аб сельска-гаспадарчай артэлі і яго прыняцьця, ён стаў неадкладна праводзіцца ў жыцьцё. Абагулена ўся рабочая скаціна (96 коняй). Пакладзен пачатак разьвіцьцю жывёлагадоўлі ў калгасе — створана база з закупленых 127 кароў, 29 цялят, 56 сьвіней і 60 авец.

З яравога кліну ў 328 гэкт. палева ўжо ўзарана. Пасеньня хапае. Зараз пратручваем увесь пасенны фонд. Прыступілі да сяўбы. За тры дні засеялі радавой сявяркай 13 гэкт. Гэта работа затрымліваецца адсутнасьцю патрэбнае колькасьці сявярак. Трэба абыходзіцца дапамогаю чалавечых рук.

Веснавая сяўба ў нас праходзіць строга паводле пляну. Сеем тыя культуры і на тых вучастках, якія нам паказаны агранэрсаналам.

Ніякіх затрудненьняў з кармамі не адчуваем, бо загадзя прынялі патрэбныя меры. Увесь інвэнтар у спраўнасьці і добра працуе. На месцы і людзі. Уся рабочая сіла разьмеркавана па пэўных вучастках і ведае свае абавязкі. Гэта выпікі шырокай папярэдняй прапрацоўкі пляну веснавой сяўбы сярод калгасьнікаў на агульных сходах і ўрэгуляваньня пытаньня з аплатаю працы.

Сяўба праходзіць у калгасе з вялікім уздымам. У нашым асяродзьдзі няма ўнадзіцкіх настрояў. Паміж калгасьнікамі не наглядаецца якіх-небудзь сурёзных непаразуменьняў. З агульнай масай індывідуальнікаў у нас зусім здавальняючыя ўзаемаадносіны.

Агульны сход членаў калгасу «Ленінец», які адбыўся гэтымі днямі, адзначыў ўжо дасягнутыя калгасам посьпехі, заявіў, што калгасьнікі і надалей будуць дружна і бязупынна працаваць для поўнага выкананьня вызначанага пляну сяўбы.

Агульны сход падкрэсьліў вялізарнае значэньне накіраваньня ў калгас на настаўную работу рабочых і вытрыманых партыйцаў, заявіўшы, што мабілізаваны ЦК КП(б)Б на дапамогу іх калгасу партыйны работнік тав. Сафронаў вельмі многа зрабіў у галіне арганізацыі працы і вытворчасьці. Тав. Сафронаў павёў сапраўдную барацьбу з варожымі калгасу элемэнтамі і здолеў арганізаваць беднату.

У дзень нараджэньня тав. Леніна калгасьнікі запэўняюць, што будуць і ў далейшым з гонарам пасіць высокую назву членаў калгасу «Ленінец», арганізавана праводзячы ў жыцьцё ўсе мерапрыемствы па ўзмацненьні свайго калгасу, тым самым узмацняючы калектывізацыю, дабіваючыся поўнай сацыялістычнай перабудовы вёскі.

ПРАЎЛЕНЬНЕ КАЛГАСУ.

ЧЫРВОНААРМЕЙЦЫ ДАПАМАГАЮЦЬ СЯЎБЕ У КАЛГАСЕ «ЧЫРВОНЫ СПЭЦЫЯЛІСТЫ» (МЕН. АКР.).

ЗДОЛЕЕМ МОЦНА ТРЫМАЦЬ ЧЫРВОНЫ СЬЦЯГ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ

Калгас памяці Леніна

КАРМА, МАГІЛЕЎСКАЙ АКР. (ПА ТЭЛЕФОНУ). У часе самай вострай барацьбы з кулацтвам і цеграю, калі асьцервяцелы кулак і варожы элемэнт шапёна і з нябывалай нагласьцю супраціўляўся нашым мерапрыемствам па сацыялістычнай перабудове вёскі, асноўная масе батрацка - бядняцка - серадняцкага сялянства Барсукоўскага сельсавету арганізавала ў студзені 1930 году калгас памяці тав. Леніна.

НА СЁНЕШНІ ДЗЕНЬ КАЛГАС МАЕ ПАД СВАІМІ СЬЦЯГАМІ 160 ГАСПАДАРАК 4-х ВЁСАК І НЕКАЛЬКІХ ПАСЁЛКАЎ СЕЛЬСАВЕТУ. У 5-ЦІ АСОБНЫХ АДДЗЯЛЕНЬНЯХ КАЛГАСУ НАЛІЧВАЕЦЦА 424 ПРАЦАЗДОЛЬНЫЯ МУЖЧЫНЫ І ЖАНЧЫНЫ, НАШ ЯРАВЫ КЛІН ДАСЯГАЕ 916 ГЭКТАРАЎ.

Перад пачаткам сяўбы была праведзена вялікая арганізацыйная работа. Абагулен увесь інвэнтар, рабочая скаціна. Ёсьць ужо калгаснае стада: 60 кароў, 20 авец, 70 сьвіней.

Аб настрої калгасьнікаў выразна сьведчыць прамова аднаго з калгасьнікаў на мітынгу, які адбыўся ў часе першага выезду ў поле. Калгасьнік тав. Пчалёнкаў, між іншым заявіў:

МЫ ЗДОЛЕЕМ МОЦНА ТРЫМАЦЬ ЧЫРВОНЫ СЬЦЯГ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ.

НА СЁНЕШНІ ДЗЕНЬ УЖО ЗААРАНА 90 ПРОЦ. ЯРАВОЕ ПЛОШЧЫ. НАСЕНЬНЕМ ЗАБЯСЬПЕЧАНЫ НА 100 ПРОЦАНТАЎ. УСЁ ЯКО АЧЫШЧАНА. У КОЖНЫМ АДДЗЯЛЕНЬНІ КАЛГАСУ АРГАНІЗАВАНЫ БРЫГАДЫ. АПОШНІЯ Ў СВАЮ ЧАРГУ РАЗЬБІТЫ НА ГРУПЫ. ПРАЦА АРГАНІЗАВАНА.

ПАЧАТАЯ ГЭТЫМІ ДНЯМІ СЯЎБА ПРАХОДЗІЦЬ ДОБРА. ЗА НЕКАЛЬКІ ДЗЕН ЗАСЕЯНА 60 ГЭКТ. ЯЧМЕНЮ, 15 ГЭКТ. АЎСУ І 6 ГЭКТ. ПШАНІЦЫ.

Члены калгасу «Памяці Леніна» абяцаюць у тэрмін засеяць увесь яравы клін. Яны запэўняюць, што пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі будуць ісьці наперад да сваіх перамог на фронце сацыялістычнага будаўніцтва. **СВАЁЙ АРГАНІЗАВАНАЙ І ДРУЖНАЙ РАБОТАЙ ЧЛЕНЫ КАЛГАСУ «ПАМЯЦІ ЛЕНІНА» ДАВЯДУЦЬ ТЫМ БЯДНЯЦКА - СЕРАДНЯЦКІМ ГАСПАДАРКАМ, ЯКІЯ СЁНЬНЯ ЯШЧЭ НЕ ЎСТУПІЛІ Ў КАЛГАС, ПЕРАВАГУ КАЛЕКТЫЎНАЕ ГАСПАДАРКІ ПЕРАД ІНДЫВІДУ АЛЬНАЙ.**

Старшыня праўленьня калгасу
сармавец **ШУБІН.**

На менскіх фабрыках і заводах ня было прагулаў

У зьвязку з вялікодныімі сьвятамі, у менскіх рабочых клюбах, чырвоных кутках 19 і 20 красавіка адбываліся антырэлігійныя вечары. У многіх прадпрыемствах выпушчаны насьценныя газэты на спэцыяльныя антырэлігійнымі матэрыямі. Узмацніўся прыцёк рабочых у вялікі саюзу бязбожнікаў.

Рабочая рада прадпрыемстваў Беларусі на агульных сходах вынесьлі пастановы аб адмаўленьні ад сьвяткаваньня вялікадня і аб выхадзе ў гэты дзень на работу.

У Менску на шпалернай фабрыцы, заводзе «Дрэваапрацоўшчык», цукеркавай фабрыцы «Камунарка», ф-цы «Кастрычнік» рабочыя ў першы дзень вялікадня зьявіліся на работу амаль па ўсе 100 проц.

На будове універсытэцкага гарадка зьявіліся на работу 94 рабочыя, на будове Дзяржбанку—7 сэзоньнікаў, на Эльводзе—15 сэзоньнікаў і т. д.

Нязгода па работу значнай групы сэзоньнікаў гаворыць аб тым, што сацыяльная арганізацыі рабочых будаўнікоў на такіх важных пабудоваах, як універсытэцкі гарадок, нічога не зрабілі для ўзмацненьня антырэлігійнай работы і не растлумачылі масам сэзоньнікаў сутнасьці рэлігійных забабонаў.

Прыклады высокай сьвядомасьці паказалі менскі рабочых. Учора па Эльводзе менскі рабочых паладзілі антырэлігійны нядзельнік на карысьць індустрыялізацыі. Такі-ж нядзельнік правялі жонкі рабочых-чыгуначнікаў таварнай станцыі МБД. Заработак з нядзельніку перадаецца на пабудову ясьлаў у адпаведным калгасе.

Нядзельнік на калгасных палёх

Калгас імя Леніна

КІЧАЎ. БАБРУЙСКАЙ АКР. (ПА ТЭЛЕГРАФУ). НАШ КАЛГАС ІМЯ ЛЕНІНА (БАЦЭВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ) ЗУСІМ НЕДАЎНА АРГАНІЗАВАЎСЯ. ЁН НАЛІЧВАЕ 30 БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК І МАЕ 55 ГЭКТ. ВОРНАЙ ЗЯМЛІ.

13-ГА КРАСАВІКА КАЛГАСЬНІКАМІ БЫЎ НАЛАДЖАНЫ НЯДЗЕЛЬНІК, ЯКІ ПРАЙШОЎ З ВЯЛІКІМ УЗДЫМАМ. У ГЭТЫ НЯДЗЕЛЬНІК БЫЛО ЗААРАНА 16 ГЭКТ. ЗЯМЛІ.

ПАЛІВЫЯ РАБОТЫ Ў КАЛГАСЕ ІДУЦЬ ШНАРКІМ ТЭМПАМ. КАЛГАСЬНІКІ ВЫЯЎЛЯЮЦЬ ВЯЛІКУЮ АКТЫЎНАСЬЦЬ І ЎЗДЫМ. ПРАЦА АРГАНІЗАВАНА. 20-ГА КРАСАВІКА—У ПЕРШЫ ДЗЕНЬ ВЯЛІКАДНЯ—КАЛГАСЬНІКІ ЗНОЎ АРГАНІЗАВАЛІ НЯДЗЕЛЬНІК.

КАЛГАС ІМЯ ЛЕНІНА ЦАЛКАМ І СВАЯЧАСОВА ЗАСЕЕ СВОЙ ЯРАВЫ КЛІН.

АСМАЛОЎСКІ.

Выклік калгасьнікам СССР

«МЫ ЗАКЛІКАЕМ: НЕ АДСТУПАЦЬ ПЕРАД ТРУДНАСЬЦЯМІ КЛЯСАВАЙ БАРАЦЬБЫ. ШНАРКА ЛІКВІДАВАЦЬ НАМЫЛКІ ГАЛАВАЦЯПАЎ, ЦЬВЕРДА ЎМАЦОЎВАЦЬ НА КАЛГАСНЫХ ПАЗЫЦЫЯХ. ДА XVI ЗЬЕЗДУ ЎСЕСАЮЗНАЯ КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫІ ВЫПРАВІМ КАЛГАСНЫ ФРОНТ КЛЯСАВАЙ БАРАЦЬБЫ.

ЗАБЯСЬПЕЧЫМ НАШЫРЭНЬНЕ НАСЕЎНАЕ ПЛОШЧЫ, ДАМО САВЕЦКАМУ КРАЮ НОВЫЯ МІЛЬЁНЫ ТОН ТАВАРНАГА ХЛЕБА. САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНЫЯ БРЫГАДЫ КАЛГАСЬНІКАЎ — ВЕРНЫ ШЛЯХ ДА ЎЗМАЦНЕНЬНЯ КАЛГАСНАГА БУДАЎНІЦТВА І ЛІКВІДАЦЫІ КУЛАЦТВА, ЯК КЛЯСЫ. ДА КАЛГАСНАЙ ПЕРАКЛІЧКІ ВЫПІКАЎ БАЛЫШАВІЦКАЙ ВЯСНЫ МЫ ЗАКЛІКАЕМ УСЕ КАЛГАСЫ САВЕЦКАГА САЮЗУ».

(З ліста калгасу Хапёрскага раёну «Ленінскі Шлях», які апублікаваны ў «Правде» ад 20 красавіка).

ПА ШЛЯХУ ЛЕНІНА

Калгас „Ленінскі шлях"

26-га красавіка 1929 году 136 бядняцка-серадняцкіх двароў вёсак Дубравіцы і Папекіна аб'ядналіся ў калгас «Ленінскі шлях» на плошчы да 2.000 гэктараў.

За год свайго існаваньня «Ленінскі шлях» мае вялізарныя дасягненьні. За год калгасьнікі пабудавалі вапельны млын, цагельню, нэрапічную майстэрню і мукамольны млын. Летась набылі трактар «Інтэрнацыянал», тры радавыя сявяркі, найскладаную малатарню, сявяркі для ўгнаеньня і сявярку для сяўбы канюшыны. Сёе у калгасе таксама аджыў свой век, яго замянілі жнівяркі.

Авёс, турнэпс, канюшна і гуркі, якія былі летась пасеяны ў калгасе, значна лепшыя, чым у вакольных сялян.

Увосень мінулага году калгасьнікі за 4 гадзіны, пад кіраўніцтвам прафэсара Горацкай сельска-гаспадарчай акадэміі Бурштэйна, пасадзілі 10 гэкт. саду.

У калгасе ёсьць 232 каровы, 5 быкоў, 143 кані, 3 жарабцы. 20 сьвіней-матак, 5 кныроў, 135 авечак і 104 ягнят.

Усе калгасьнікі разьбіты на групы, якія прымацаваны да паасобных галін гаспадаркі, паляводзтва, садоўніцтва, гародніцтва і будаўніцтва. На чале кожнай групы выдзелены старшы брыгадзір.

Кожны вечар старшыні брыгад разам з загадчыкамі асобных галін гаспадаркі і старшынёю праўленьня калгасу зьбіраюцца і абгаворваюць план работ на заўтрашні дзень, разьмяркоўваюць людзей. У вытворчых нарадах прымае актыўны ўдзел большасьць калгасьнікаў.

У калгасе сялянае значна ўзьнялі свой культурны ўзровень, амаль кожны двор выпісвае газэту. 1-га мая ў калгасе ў былой царкве адкрываецца клюб.

Партыйная ячэйка калгасу «Ленінскі шлях» за апошні месяц значна павялічылася, у яе рады ўступіў 21 калгасьнік. Усяго ў ячэйцы 34 члены.

За 9 месяцаў калгас «Ленінскі шлях» мае чыстага прыбытку 15.708 р. 35 к.

Пра «Ленінскі шлях» ведаюць сяляне амаль усёй акругі і за сотні вёрст прыяжджаюць паглядзець, як там будуецца новае жыцьцё. Зараз калгас шырока разгарнуў палявыя работы.

Год работы калгасу «Ленінскі шлях» паказаў, што калгасьнікі выканалі сваё абяцаньне Цэнтральнаму Камітэту Усесаюзнай камуністычнай партыі і шчарка рухаюцца наперад на ленінскім шляху.

ГУТА ІМЯ ІЛЬЛІЧА АПРАЎДВАЕ СВАЮ НАЗВУ

ПЕРШАЕ ПАЎГОДЗЬДЗЕ ГУТА ЗАКОНЧЫЛА З ПОСЬПЕХАМ ПЛЯНАВЫЯ ЗАДАНЬНІ ПЕРАВЫКАНАНЫ

Адна з лепшых гут Беларускага шклоаб'яднаньня носіць назву **Уладзімера Ільліча** (ст. Быхаў, Магілеўскай акругі).

Яшчэ ў 1924 годзе гэта была невялічкая гута з аднэй гаршковай печчу з 160 рабочымі. Завод працаваў тады па дрэўняным апале і выпускаў 490 тон прадукцыі. Жыльлёвых памяшканьняў для рабочых вакол заводу ня было. Толькі асобныя высокакваліфікаваныя майстры - шкладувы мелі свае кватэркі, большая-ж частка рабочых жыла на хутарох і ў вёсках і хадзіла кожны дзень на 10-12 вёрст на работу. Гэта — мінулае.

Сёньняшні «ІЛЬЛІЧ» зусім іншы. Ён вырас за некалькі гадоў і стаў вялікім заводам. Зараз завод працуе на тарфяным апале і мае перад сабой вялікія пэрспэктывы. Ужо няма прымітыўнай гаршковай печы, ёсьць шкладальная ванная печ, якая працуе бесьперапынна на 4 зьмены.

У 1924 годзе гута выпусьціла 493 тоны рознага шкла на суму 247.600 рублёў, а за адно першае паўгодзьдзе бягучага 1929-30 г. гута выпусьціла 1.325 тон прадукцыі на суму 491.000 руб. За ўвесь бягучы гаспадарчы год гута, паводле пляну, павінна выпусьціць 2.290 тон рознага шкла на суму 862.600 руб.

Завод добра спраўляецца са сваімі заданьнямі. За першае паўгодзьдзе 1929-30 г. вытворчая праграма выканана на вазе на 106 проц., па коштце —на 105,8 проц.

Прадукцыйнасьць працы за паўгодзьдзе ўзьнята на 4,8 проц.

Плян па зьніжэньні сабекошту прадукцыі **перавыкананы**. Паводле даных, на 1 сакавіка гута зьнізіла сабекошт прадукцыі на 8,31 проц., замест 5 проц., вызначаных планам.

Завод спэцыялізаваўся, зараз ён вырабляе выключна антэкарскую і гаспадарчую пасуду. Гэта дае магчымасьць гуце рацыяналізаваць сваю вытворчасьць, дабіцца яшчэ больш высокай прадукцыйнасьці працы.

Вакол гуты вырас вялікі рабочы пасёлак. Кожны год асыгнуюцца значныя сумы на жыльлёвае будаўніцтва для рабочых. У мінулым годзе на тэрыторыі заводу пабудавана 25 новых дамоў на 70 кватэр, выдаткавана 170 тысяч руб.

У гэтым годзе адпушчана на жыльлёвае будаўніцтва 125.000 рублёў. Будуць пабудаваны 10 дамоў на 40 кватэр. Для рабочых - сэзоньнікаў ёсьць сэзоньныя пасёлак.

Пры гуце ёсьць рабочы клюб, дзе вядзецца культурна - выхаваўчая работа сярод рабочых і работніц.

Рабочая сталоўка, больніца, лазьня, пабудаваная ў мінулым годзе, — усё гэта новыя заваяваньні рабочых гуты **імя Ільліча.**

Рабочы добра зразумелі задачы, якія стаяць перад імі. Яны прыкладаюць усе сілы, каб выканаць ускладзеныя на іх задачы ў галіне выкананьня прамфінпляну, барацьбы за працоўную дысцыпліну і прадукцыйнасьць працы, супроць прагулаў, п'янства.

Гута імя Ільліча апраўдвае сваю назву.

С. Г.

Арганізавананасьць калгасаў узьнімае іх аўтарытэт сярод сялянства

Калгас імя Леніна, Аршанскага раёну, наладзіў пробны выхад у поле, які прайшоў вельмі арганізавана. Калгасьнікі сваячасова і дружна зьявіліся на работу. За некалькі гадзін было заворана каля 5 гэкт. зямлі.

У пробным выхадзе прымалі ўдзел і шэфы — рабочыя Асінбуду. На мітынг, праведзены ў полі пры заворваньні першай баразны, зьявілася шмат сялян вакольных вёсак. Калгасьнікі, выступаўшыя на мітынгу — старыя дзяды, заклікалі ўсіх сялян арганізавацца ў калгасы і пановаму перабудаваць сваё жыцьцё.

Беднякі і сераднякі вакольных вёсак, якія ня ўступілі ў калгас, увесь час пільна сачылі за пробным выхадам у поле. Арганізаванасьць калгасьнікаў зрабіла на іх вельмі добрае ўражаньне.

Каб забясьпечыць калгас выстарчальнай колькасьцю насеньня, шэфская арганізацыя Асінбуду выдала на гэтую мэту 300 рублёў.

А. М.

У жорсткай клясавай барацьбе

узмацняем калгас

Калгас імя Леніна

КАРМА, Магілеўскай акр. (Па тэлеграфу). Наш калгас імя Уладзімера Ільліча Леніна арганізаваўся яшчэ вясной 1929 г. і зараз знаходзіцца ўжо на правільным шляху.

У жорсткай барацьбе з клясавым ворагам, які ўсялякімі мерамі перашкаджаў арганізацыі калектыўнае гаспадаркі, быў створан наш калгас. Кулацтва вяло шалёную агітацыю супроць арганізацыі калгасу. Але, урэшце, 20 бядняцка - серадняцкіх гаспадарак усё-ж арганізаваліся ў чаі мінулага году тады яшчэ невялікі калгас па плошчы ў 193 гэкт., якому было надана імя Уладзімера Ільліча Леніна.

Калгасьніцы разумелі, якая адказнасьць ляжала на іх і сапраўды іякнуліся з гонарам пасіць назву калгасьнікаў калектыву імя Леніна. Мы сустрэліся з вялізарнай колькасьцю труднасьцяй, але настойна перамагалі іх і ўсё больш і больш замацоўвалі калгас. У мінулую веснавую кампанію нашы калгасьнікі аралі на худых конях, працавалі зношаным, паламаным інвэнтаром. Толькі шляхам гэраічных намаганьняў нам удалося летась засеяць усю плошчу.

Увосень, калі мы прыбіралі нашы першы ўраджай, з'явілася бядняцка-серадняцкае сялянства на справе ўпэўнілася ў тым, што калгас можа даць селяніну значна лепшае жыцьцё, чым дробная індывідуальная гаспадарка.

Увосень мы ўжо мелі магчымасьць крыху палепшыць гаспадарчае становішча калгасу. З 106-ці абагуленых увесну коняй 26 было выбракавана і замест іх куплена 8 добрых коняй.

За мінулае лета мы пабудавалі новы двор для жывёлы, сьвіран, плодасушылку, арганізавалі насеннаводную гаспадарку, дакупілі кароў, падрыхтавалі патрэбную колькасьць насеньня на будучы год, набылі жнівярку, малатарню. Наш калгас перайшоў на 9-ці налёвы севазварот. Ня гледзячы на тое, што гаспадарка была маленькая, нашы 63 працаздольныя члены калгасу жылі ня горш, чым іншыя сярэдняя сялянскія гаспадаркі — і гэта ў першы цяжкі год існаваньня калгасу.

Усе гэтыя нашы посьпехі зрабілі вялікі ўплыў на сялян, якія не ўвайшлі ў калгас. Вось чаму ўвосень да нас далучылася яшчэ 19 двароў з плошчаю ў 144 гэкт. Акрамя таго, калгас імя т. Леніна узбуйніўся, аб'яднаўшыся з калгасамі «Ільліч» і «Новы сьвет». Ён ужо меў 1.192 гэкт. ворнай зямлі і 104 бядняцка - серадняцкія сям'і.

Зараз у нашым калгасе ўжо разгортваецца сяўба. Пасеньня хапае, але адчуваем недахват цягавай сілы—усё яшчэ мала коняй. Атрымалі 3.000 руб. на куплю коняй, гэта значна аблегчыць нашае становішча.

На 19-га красавіка мы ўжо засеялі 35 гэкт. аўсу і ячменю, 112 гэкт. узорана пад іншыя культуры.

Калгас імя Уладзімера Ільліча выканае цалкам плян веснавой сяўбы і сваячасова засее ўвесь свой яравы клін. Да гэтага яго абавязвае тое, што ён носіць імя вялікага настаўніка тав. Леніна, тое, што ён павінен зьявіцца ўзорным калгасам для ўсяго раёну.

СТАРШЫНЯ ПРАЎЛЕНЬНЯ КАЛГАСУ КУПРЗЕЎ.

УДАРНІЦЫ ЗА ДАЕНЬНЕМ КАРОЎ (КАЛГАС «ЛЕНІНСКІ ШЛЯХ», КЛІМАЎШЧЫНА)

Выконваем заветы Уладзімера Ільліча

Картонная фабрыка ў Новых Уталоках (14 вёрст да ст. Нухавіч) калісьці была невялічкай фабрыкай з двума дзесяткамі рабочых, з агульнай выпрацоўкай 500 тон картону ў год.

Цяпер гэтая фабрыка носіць імя Уладзімера Ільліча Леніна. На фабрыцы — звыш 50 рабочых. Цяпер гадавая выпрацоўка прадукцыі ўзрасла больш як у 2 разы.

Фабрыка працуе сацыялістычнымі тэмпамі. За першае паўгодзьдзе бягучага 1929-30 гаспадарчага году выпушчана 625 тон картону замест 592 тон, вызначаных планам. Плян за гэтае паўгодзьдзе выкананы на **106,8 проц.**

За 1929-30 г. фабрыка, паводле пляну, павінна выпусьціць 1.185 тон картону на суму 338.000 руб. У 1930-31 годзе колькасьць прадукцыі мяркуецца павялічыць да 1.455 тон.

Можна быць упэўненым, што фабрыка справіцца з ускладзенымі на яе задачамі. Фабрыка імя Уладзімера Ільліча зьяўляецца сапраўды сацыялістычнай фабрыкай, якая няўхільна выконвае заветы Уладзімера Ільліча аб узьнятьні прадукцыйнасьці працы і працоўнай дысцыпліны, аб зьніжэньні сабекошту прадукцыі і г. д.

За першае паўгодзьдзе фабрыка дабілася зьніжэньня сабекошту **на 15 проц.** Прадукцыйнасьць працы фабрыкі, паводле заданьня, павінна была быць узьнята на 34 проц. Фабрыка з гонарам выканала гэта заданьне і нават перавыканала яго. **Яна дабілася ўзьнятьня прадукцыйнасьці працы на 35,7 проц.** Ліквідаваны прагулы зведзены да мінімуму.

Перад фабрыкай стаяць вялікі перспэктывы паляпшэньня.

Д. Р—и.

Транспартнікі перадаюць Рэвсавету 9 бранзавікоў

Для прыняцьця ўдзелу ў сьвяткаваньні 1-га мая саюз транспартніка БССР пасылае у Маскву сваіх прадстаўнікоў, якія ад імя транспартных рабочых Беларусі перададуць Рэвсавету 9 бранзавых аўтамабіляў. Сродкі на набыцьцё гэтых аўтамабіляў былі сабраны праз правядзеньне суботнікаў.

Што перадае Менская радыёстанцыя

Аўторак, 22-га красавіка

17-00. Пасьлядзены канцэрт.
17-30. Перадача для піянэраў і школьнікаў.
18-00. Беларускі радыёгазэта.
19-00. Пленум [illegible]
19-00. Доклад [illegible] і работа Леніна.
19-30. Гадзіна абароны краіны і Чырвонай армі. Пытаньні абароны.
20-00. Рабоча-сялянскі універсытэт радыё.
21-00. Канцэрт.

Серада, 23-га красавіка:

17-00. Пасьлядзены канцэрт.
17-30. Гадзіна пралетарскага студэнцтва.
18-00. Беларуская радыёгазэта.
19.00. Пленум часу.
19-00. Радыёслухачоў чытачоў газэты «Сельска-гаспадарчы рабочы»—доклад рэдакцыі і выступленьне рабкораў.
20-00. Рабоча-сялянскі універсытэт радыё.
21-00. Газэта на татыцкай мове.
21-30. Канцэрт.

Клюб Кавуновых Працаўніковаў

Намечаны лекцыі на Уводзінах у дыялектыкі матэрыялізм.

1 лекцыя—аснова [illegible] этапы разьвіцьця матэрыял. дыялектыкі—**С. Я. Вальфсон.**
2 лекцыя—[illegible] грам. працэсу—**Р. М. Выдр[illegible]**
3 лекцыя—барацьба клясаў і вучэньне аб [illegible] культуры пралетарыяту,—**т. Галанза.**
4 лекцыя—тэорыя вытворчых сіл і вытворчых [illegible]—**т. Сакерская.**
5 лекцыя—дысцыпліна дыялектычнай мэханістыкі—**т. Калабрынскі.**

1-я ЛЕКЦЫЯ адбудзецца 28 красавіка ў 8 гадзін увечары.

Ад [illegible] лекцый будзе наведамлена асобна.

Бяз Леніна пад ленінскім сьцягам

Прайшло 60 год з дня нараджэньня Уладзімера Ільліча Леніна. Уступіўшы на шлях рэвалюцыйнай дзейнасьці ў годы жорсткай рэакцыі і найвялікшай эксплёатацыі рабочае клясы «маладым» расійскім капіталізмам, Уладзімер Ільліч **трыццаць год** свайго жыцьця **цалкам аддаў** справе рэвалюцыйнай барацьбы рабочае клясы, справе пралетарскай рэвалюцыі.

Вялізарная самаадданасьць справе барацьбы рабочае клясы, непахісная вера ў сілы і нямінучую перамогу пралетарыяту, глыбокая сувязь з масамі, уменьне ў кожны перыяд з зьдзіўляючай выразнасьцю і дакладнасьцю ўхапіцца за «чарговае зьвяно», за самую сутнасьць пытаньня, непахіснасьць, бальшавіцкая цьвёрдасьць і бліскучае ўжываньне марксыцкага мэтаду ў практыцы рэвалюцыйнай дзейнай барацьбы зрабілі Леніна ня толькі арганізатарам, але і правадыром перадавога авангарду расійскага пралетарыяту, правадыром пралетарскай рэвалюцыі і Камуністычнага Інтэрнацыяналу. Ленін вырасьціў у полымі рэвалюцыйнай барацьбы непераможную, скаваную сталёвым адзінствам, згуртаваную непахіснай дысцыплінай «жалезную гвардыю рэвалюцыі» — УсеКП(б), вядучую над ленінскім сьцягам пралетарыят, беднату і асноўныя пласты сялянства да апошніх і рашучых схваткаў з капіталізмам да пераможных баёў за будаўніцтва сацыялізму.

Ленін злучыў у сабе якасьці і рысы глыбокага практыка - арганізатара рэвалюцыі і найвялікшага мысьляцеля, рэвалюцыйнага тэарэтыка, якога толькі ведалі першыя дзесяцігодзьдзі XX века.

Сіла Леніна, як найвялікшага рэвалюцыянэра - практыка і тэарэтыка марксызму, заключаецца ў тым, што ён штодзённую жыцьцёвую практыку працоўных мас перакладаў на мову клясавай барацьбы, рэвалюцыйную барацьбу за сацыялізм асьвятляў рэвалюцыйнай тэорыяй — марксызмам і рэвалюцыйную тэорыю наскрозь пранізваў практыкай клясавай барацьбы, рэвалюцыйнай практыкай пралетарыяту, які змагаецца. Вязуньня змагаючыся **за непарыўную сувязь тэорыі** з практыкай, у агні клясавай барацьбы Ул. І. Ленін пратаўрыў тэорыю марксызму ў найвялікшую сілу пралетарскага руху і пралетарскай рэвалюцыі. Недарма «ленінізм ёсьць тэорыя і тактыка пралетарскай рэвалюцыі ў вогуле, тэорыя і тактыка дыктатуры пралетарыяту асабліва». (Сталін). Ленінізм, як просты працяг марксызму, як тэорыя пралетарыяту, які змагаецца за сацыялізм, харчуе практыку барацьбы пралетарыяту.

Ленінізм пранізан адзінствам рэвалюцыйнай тэорыі і рэвалюцыйнай практыкі. Ленінізм таму і склаўся ў вялізарнай важнасьці сілу пралетарскага руху, што ён рос і складваўся ва ўмовах клясавай барацьбы, у абстаноўцы непасрэднай рэвалюцыйнай практыкі.

Непераможная бяда расійскага пралетарыяту з капіталізмам, якія завяршыліся Кастрычніцкай рэвалюцыяй, як пачаткам сусьветнай сацыялістычнай рэвалюцыі, усё больш вострыя супярэчнасьці ў капіталістычным лягеры, рост згуртаванасьці рабочых мас пад сьцягам Камінтэрну, разгортваньне грандыёзнай сацыялістычнай будоўлі ў СССР служылі вялікай гістарычнай праверкай ленінізму, як рэвалюцыйнай зброі рабочае клясы ў барацьбе за пабудаваньне камуністычнага грамадзтва. Ва ўмовах разрухі прамысловасьці і сельскае гаспадаркі Ленін геніяльна прадбачыў мас. Савецкі пралетарыят ад ударсацыялізму. Падагульваючы вынікі першага году НЭПу, Уладзімер Ільліч гаварыў, што «Расія непаўская будзе Расіяй сацыялістычнай». У гэтых словах Леніным выказана ня толькі непахісная вера ў нямінучую перамогу сацыялізму, але і геніяльна ахоплен плян сацыялістычнага будаўніцтва, намаляваны Леніным: электрыфікацыя, буйное машынабудаўніцтва, трактарызацыя і падвядзеньне магутнай тэхнічнай базы над змычку сацыялістычнай прамысловасьці з сельскай гаспадаркай.

Гэты плян, будучы ўвасаблёным у пацыёнку, у палітыку сацыялістычнага перабудаваньня сельскае гаспадаркі праз ажыцьцяўленьне суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва, як клясы, з вялізарным энтузіязмам выкопваецца працоўнымі масамі Савецкага Саюзу, бо ён, гэты плян, ёсьць ня толькі выкананьне дэвізу «дагнаць і перагнаць», але і найвялікшая зброя барацьбы за пабудову сацыялізму ва ўсім сьвеце.

Пад знакам выкананьня ленінскіх паказаў партыя і рабочая кляса дабіліся вялізарнейшых зьмен ва ўсёй народнагаспадарчай сыстэме.

Даваенны ўзровень разьвіцьця прамысловасьці пакінуты далёка з-заду. Надзвычай шнаркімі тэмпамі растуць асноўныя галіны цяжкай прамысловасьці. Вугаль, нафта, мэталургія, машынабудаўніцтва даюць дзесяткі прыцантаў штогадовага прыросту вытворчасьці.

Створаны волаты: Волхаўбуд, Балахнінскі камбінат, Трактарабуд, Сельмашбуд і інш. Будуюцца яшчэ больш гіганты: Дняпрабуд, Магнітабуд, Аўтабуд і інш.

Надзвычайная хваля працоўнага энтузіязму і сацыялістычнага спаборніцтва ахапляе найцярэпныя пласты рабочых мас. Савецкі пралетар ад ударных брыгад і цэхаў пераходзіць да ўдарных заводаў.

Вясною 1930 году на палёх СССР цяжкія пласты чорназему і векавой цаліны арудуць 90 тыс. трактараў. Сотні МТС — саўгасы — прыкладам, па лістыны шлях разьвіцьця вёскі і прабіваюць векавую традыцыю, інэртнасьць дробнага індывідуальнага гаспадарання.

У аспоўных пластох сялянства адбываецца сапраўдны «вялікі» пералом. Традыцыйныя векавыя мэтады гаспадараньня руйнуюцца, уступаючы месца новым формам аграмаднаванай гаспадаркі. Грамадзкія адносіны, якія характарызавалі першыя этапы нашай гаспадартай палітыкі, пачынаюць рашуча перамагацца.

У працэсе жорсткай клясавай барацьбы з кулацка - капіталістычнымі элемэнтамі вёскі удалося настолькі падарваць іх эканамічную магутнасьць, што стала магчымай задача ліквідацыі кулацтва, як клясы, непарыўна зьвязаная з правядзеньнем суцэльнай калектывізацыі.

Пад калгасны рух падведзена магутная рэальная база. **«Карэнны паварот ёсьці да сацыялізму можна пачаць ужо забясьпечаным»** (Сталін). Партыя ўступіла ў паласу замацаваньня дасягнутых у галіне сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі посьпехаў. І толькі праваапартуністычныя панікёры і «левыя» фразэры, пазьбіты спадарожнікі правых, могуць гістэрычна шыпець аб тым, што над калгасным рухам ня было базы.

Рашучая барацьба з правай небясьпекай, як асноўнай на даным этапе, з нерагібамі, правядзеньне прынятых партыяй мерапрыемстваў, вялізарнейшы ўздым у сярэдняцкіх масах сялянства, як водгук на гэтыя мерапрыемствы, першыя вынікі веснавой сяўбы—служаць ленінным абвяржэньнем апартуністычнага шыпеньня і рознастайных тэорый апартуністычных элемэнтаў.

Клясы, якія выходзяць з гістарычнай арэны, не

ЗЬВЯЗДА.
МЕНСК

II ГОД НА ВАРЦЕ МЕЖАЎ СССР СТАІЦЬ ЧЫРВОНАСЬЦЯЖНЫ АСТРАХАНСКІ ПОЛК

СЛАЎНАЯ ГАДАВІНА

11 год таму назад ля берагоў Касьпійскага мора арганізаваўся слаўны Астраханскі кавалерыйскі полк.

У баёх грамадзянскай вайны полк шляху адным з першых і за гераічную абарону Астрахані і Царыцына атрымаў імя Чырвоны Сьцяг ад Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту.

Сярод маладых байцоў астраханцаў, захаваўшых слаўныя баявыя традыцыі стараных байцоў, імкнуцца дапамагаюць выхоўваць і падрыхтоўваць да будучых войнаў новую моцную зьмену.

Моцная і здаровая ў палку партыйна-камсамольская арганізацыя, якая вядзе ідэю на шляху замацаваньня баяздольнасьці гатоўнасьці палка.

Партыйна-камсамольская арганізацыя не адрываецца ад жыцьця ўсёй краіны. У палку заключаны дагаворы на сацыялістычным спаборніцтве з радам шэфствуючых прадпрыемстваў. Праведзена генеральная работа па ахоне калгасным рухам чырвонаармейцаў, і з байцоў палка створана чырвонаармейская камуна на ВВА на Маркінскім балотным масыве.

Зараз у палку заноў рыхтуецца 180 калгаснікаў для сацыялістычнай перабудовы вёскі.

У гэтым навучальным годзе полк цалкам праводзіць загад Рэвваенсавету аб баявой падрыхтоўцы і зьнішчае тыя недахопы, якія перашкаджаюць яму поўнасьцю дабіцца добрых вынікаў ва ўсёй сваёй рабоце.

Полк павінен дабіцца выкананьня поўнага курсу страляніны, выразнасьці ў работе, поўнай адпрафоўкі байца ў тактычных заняткох і павінен павысіць тэмп ва ўсёй сваёй рабоце.

Ягоная задача—паленьніцца сваю сувязь з шэфамі, выкарыстаць наступаючы летні перыяд і прыступіць да плянавай ваеннай работы сярод іх, арганізоўваць выхады ў поле, спаборніцкія стрэльбы, наладжваць гульні, паказальныя тактычныя заняткі і гэтым самым замацоўваць ваенныя веды і навыкі сярод рабочых і служачых падшэфных прадпрыемстваў.

Наша задача ў 11 гадавіну палка яшчэ мацней згуртаваць вакол партыйнай арганізацыі, уцяміць і выканаць генеральную лінію партыі ў справе індустрыялізацыі і калектывізацыі краіны і тым самым узмацняць абаропаздольнасьць першай у сьвеце рэспублікі працы.

Камандзір і камісар палка ВОЛЬСКІ.

БАЯВЫ ШЛЯХ
ЧЫРВОНАСЬЦЯЖНАГА КАВАЛЕРЫЙСКАГА ПАЛКА
ЛЯ КАСЬПІЯ

Пажар грамадзянскай вайны ахапіў гутары і станіцы Паўночнага Каўказу.

У жорсткім клясавым змаганьні працоўнае казацтва Кубані і Цераку, пачаўшы крывёю сваёй шлях, адступала перад добра ўзброенымі белагвардзейскімі атрадамі.

Адрэзаныя ад цэнтру Савецкай Расіі, без зброеныя, пад белагвардзейскімі кулямі і ахвячаныя страшнай хваробай—тыфусам, чырвоныя часьці арабілі нечуваны ў гісторыі гэраічны паход праз астраханскія стэпы.

З рэшткаў XI-й гэраічнай Паўночна-Каўказкай армії пачаў фармавацца ў красавіку месяцы 1919 г. слаўны 37-мы полк.

Касьцяк пашчэнт разьбіті генералам Працовым. За бай над сялом Аксайскім полк атрымаў Чырвоны Сьцяг ад Усесіла.

У баёх пад Нікольскам, калі толькі змоўклі гарматы і кулямёты, сабраліся камуністы палка на свой першы арганізацыйны сход, дзе выбралі партыйнае бюро і свайго першага старшыню.

А пасьля арганізацыйнага сходу — у начны бой за чырвоны Царыцын, за чырвоны Вэрдэн.

Царыцын абаранілі.

НА ЎРАНГЕЛЯ

Адпачыў крыху полк і зноў у бой.

Перакінулі ў складзе ўсёй дывізіі на Паўдзённы фронт на Ўрангеля.

Ва фляг ля Марыупалю б'е полк на белых часьцях. А потым ночу ў рэйд, у тыл Ўрангелю.

Трое сутак без перапынку ідзе дывізія, зьнішчаючы на сваім шляху часьці праціўніка.

А ноцым слаўны бой пад Багданаўкай. Троіцкім і ст. Фёдараўкай, дзе ў ліхой атацы сутыкнуліся з палкамі белых і зьнішчылі іх.

А там Перакоп. Нястрымнай лавінай рушыў полк на Ющунскія ўмацаваныя пазыцыі. Лівень агню і сталі ня спыніў байцоў, ахвячаных жаданьнем разгромыць войска белагвардзейскага паследка.

У ліхой атацы прарваны былі ўмацаваньні, пасечаны іх абаронцы і жалезным поступам уступілі чырвоныя войскі ў вызвалены Крым.

НА МІРНУЮ ВУЧОБУ

Мінулі гады. Пільна захоўваюцца баявыя традыцыі ў палку. Старыя вэтэраны—камандзіры, выхоўваюць маладых байцоў да будучых баёў за сусьветную рэвалюцыю.

На штогадовых манэўрах і асабліва на мінулых усесаюзных бабруйскіх манэўрах, полк паказаў сваю баявую гатоўнасьць і цяпер у дзень свайго 11-цігадовага юбілею, у дзень слаўнай баявой гадавіны, увесь склад палка, першага ў дывізіі ўдарнага палка, заняўляе.

— У любую мінуту 37-мы Астраханскі чырвонасьцяжны полк к бою гатоў.

Вількабрыскі.

37-му кавпалку 7-й самарскай кавдывізіі

У дзень XI-гадовага юбілею 37-га кавпалка, яго камандзірам, палітработнікам і чырвонаармейцам, мы чырвоныя партызаны, служыўшыя ў 37-м кавпалку з дня яго арганізацыі і прымаўшыя ўдзел у баёх супроць ворагаў Савецкага Саюзу ў радох слаўнага чырвонасьцяжнага палка, шлем сваё палкае прывітаньне і спадзяемся, што 37-мы кавполк да другога дзесяцігодзьдзя будзе сьвяткаваць перамогу над усімі ворагамі працоўных мас.

Мы, дэмабілізаваныя чырвоныя партызаны, знаходзячыся ў бестэрміновым водпуску, спакойна робім за сьпіной Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі нашу вялікую справу—будаўніцтва сацыялізму, паводле наказаў вялікага правадыра Ўладзімера Ільліча Леніна.

Няхай жыве 37-мы кавполк, верны вартаўнік межаў Савецкага Саюзу!

Няхай жыве правадыр Чырвонай арміі —Усесаюзная Камуністычная Партыя!

Ад імя калектыву чырвоных партызан станіцы Каўкаская, служыўшых у 37-м кавполку з дня яго арганізацыі чырвоных партызан 37-га кавпалка, кавалер ордэну Чырвонага Сьцягу № 1318—

Ф. С. КІРЫЧЭНКА.

Перад 1-м мая
фізкультурнікі—у дзень 1-га мая

У першамайскіх дэманстрацыях прыме ўдзел 200 фізкультурнікаў саюзу мэталістых, а якіх 50 вялёсыпедыстых. У часе дэманстрацыі фізкультурнікі-мэталістыя будуць рабіць фізкультурныя практыкаваньні, піраміды і інш.

2-га мая адбудуцца фізкультурныя сустрэчы па футболе паміж першай камандай мэталістых і «Дынамо», другой камандай мэталістых і АБВШ. Апрача таго, адбудуцца сустрэчы на баскет-боле і валейболе паміж мэталістых і шэфнікамі.

Ільготы мэдпрацаўнікам, якія едуць на вёску

Савет Народных Камісараў БССР вынес пастанову аб тым, што мэдпрацаўнікі, якія пасылаюцца на пастаянную работу на вёску, калі гэта пасылка зьвязана з пераменай месца жыхарства, атрымліваюць кошт праезду і правозу маемасьці, а таксама сутачную і аднаразовую дапамогу ім і членам іх сем'яў.

Калі мэдпрацаўнікі пасьля двухгадовай працы на вёсцы варочаюцца ў горад, дзе яны раней служылі, дык яны маюць права заняць ранейшую пасаду ва ўстанове, калі гэтай пасады няма, атрымаць працу без чаргі ў іншых установах, а таксама маюць права атрымаць жылую плошчу без чаргі для сябе і членаў сям'і.

Члены сям'і мэдпрацаўнікоў, якія знаходзяцца на іх утрыманьні і засталіся на месцы ранейшага жыхарства, маюць права зарэгістравацца на біржы працы.

У Акадэміі Навук

— Прэзыдыум Беларускай Акадэміі Навук пастанавіў **рэарганізаваць цэнтральнае бюро краязнаўства** ў мэтах набліжэньня яго работы да агульных задач сацыялістычнага будаўніцтва. Пры цэнтральным бюро арганізуюцца секцыі прамысловасьці, сацыялістычнага земляробства і дашкольнага выхаваньня.

— **На першую ўсесаюзную канфэрэнцыю па мэтэаралёгіі**, якая адбудзецца ў Ленінградзе, БАН камандыруе праф. **Сіроціна.** Канфэрэнцыя будзе працаваць 5-9 па 15 мая.

Вэлёсыпэды для БССР

— На 1930 г. для БССР прызначана 1.600 вэлёсыпэдаў, у тым ліку 400 замежных. У першым паўгодзьдзі ужо атрымана 360 вэлёсыпэдаў. Наркамгандалю БССР зьвярнуўся да Наркамгандалю СССР з просьбай прыняць меры да адгрузкі ў бліжэйшы час яшчэ 1.000 вэлёсыпэдаў.

ЗА ДЗЕНЬ

— Беларуская с.-г. Акадэмія атрымала 27 мясц для пасылкі **хворых студэнтаў на курорты Крыма і Каўказа.**

— **Макаронная фабрыка ў Нова-Барысаве** значна пашырацца, выпуск прадукцыі макаронай фабрыкі павялічваецца з 3-х тысяч тон да 8 тысяч тон у год.

— У Беларусі арганізуецца **новы трэст па распрацоўцы каменю, гравія і пяску.** Трэст будзе знаходзіцца пры будаўнічым аб'яднаньні ВСНГ БССР.

— Цэнтральнае пажарнае кіраўніцтва распачало падрыхтоўку да правядзеньня **двухтыднёвіка пажарнае аховы,** які пачнецца 1-га чэрвеня. Задача двухтыднёвіка—зьвярнуць грамадзкую ўвагу вакол аховы гораду і вёскі (у прыватнасьці калгасаў) ад пажараў.

Пабудова электрастанцыі ў Бабруйску

— **Прэзыдыум ВСНГБ зацьвердзіў праект пабудовы ў Бабруйску НОВАЙ РАЁННАЙ ЭЛЕКТРЫЧНАЙ СТАНЦЫІ МЯСЦОВАГА ЗНАЧЭНЬНЯ магутнасьцю ў 10 тысяч кілёват. Станцыя будзе таксама абслугоўваць бліжэйшыя калгасы і новы цэльлюлёзны камбінат. Агульны кошт будаўніцтва капя 8 мільёнаў рублёў.**



ПРАЕКТ ПАБУДОВЫ БЕЛАРУСКАЙ ГЕОФІЗЫЧНАЙ АБСЭРВАТОРЫІ

24-га красавіка ў 18 гадз. у **Доме Камасьветы** адбудзецца 1-ны куставы сход наступных ячэек КП(б)Б Фрунзенскага раёну: зав. «Камунар», Эльводу, Мэталюстаноў, ПКЗ, каап. прад. харчэнкоў, хлебазаводу, акрфа, акрад, В. Э. О., адд. хлебазаводу, зав. «Камунарка», «Беларусь», «Пралетары», Савгасгаду, гандлятор. ф-кі і сталовае МПРК.

Парадак дня: даклад т. **Шпэктара** аб рабоце райкому. Яўка абавязкова.

Мабілізаваць вольныя сродкі працоўных— на патрэбы капітальнага будаўніцтва

Пазыка „Пяцігодка— за 4 гады"

Асноўнае прызначэньне новай пазыкі «Пяцігодка—за чатыры гады», **забясьпечыць мабілізацыю патрэбных сродкаў на выкананьне пяцігадовага пляну сацыялістычнага будаўніцтва за чатыры гады.**

Мы павінны імкнуцца да таго, **каб сродкі, сабраныя праз дзяржпазыкі, знаходзіліся ў распараджэньні дзяржавы ў працягу таго тэрміну, на які пазыкі выпушчаны.** Продаж і заклад трымальнікамі сваіх аблігацый да вызначанага дзяржаваю тэрміну парушае плянавае фінансаваньне пяцігадовага пляну нашата будаўніцтва. Асноўная маса працоўных зразумела важнасьць прыцыпу доўгатэрміновасьці дзяржпазык. Але побач з гэтым, некаторыя трымальнікі вельмі «лёгка», няўважліва адносяцца да сваіх абавязацельстваў перад пралетарскай дзяржавай. Яны вельмі часта без асабліва вострай патрэбы прадаюць або закладваюць набытыя імі аблігацыі. Каб зьнішчыць такія ненармальныя зьявішчы, перадавыя кадры рабочых нашых пралетарскіх цэнтраў прапанавалі новыя формы грамадзкага кантролю над продажам ці закладам аблігацый трымальнікамі. Кожны трымальнік павінен добра сабе ўсьвядоміць, што **новы парадак захаваньня аблігацый зусім не азначае зьнішчэньня пікіднасьці нашых масавых дзяржпазык:** аблігацыі новай пазыкі і тых пазык, якія павінны быць абменены на яе, таксама можна прадаваць, або закладваць, але гэтыя апэрацыі могуць рабіцца трымальнікамі толькі з дазволу камісій садзейнасьці дзяржкредыту і ашчаднасправе. Такі парадак забясьпечвае, з аднаго боку, сапраўдную доўгатэрміновасьць дзяржкредыту і, з другога боку, дае магчымасьць трымальнікам распараджацца сваімі аблігацыямі, прадаваць і закладваць іх пры асабліва вострай патрэбе.

Ягоная адна асаблівасьць новай рэформы сыстэмы дзяржпазык заключаецца ў тым, што на пазыку «Пяцігодка—за чатыры гады» абменьваюцца ўсе аблігацыі 1-ай, 2-й і 3-яй пазык індустрыялізацыі і пазыкі ўзмацненьня сельскае гаспадаркі. Апрача таго, гэта рэформа спрашчае тэхніку дзяржкредыту і зьмяншае выдаткі на абслугоўваньні шматмільённых трымальнікаў нашых пазык.

Л—н.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЁНЬНЯ

Пэдгабінэт. У 19 гадз. настаўн. канфэр. аб працоўных працэсах. Разгляд новых праграм.

— У 19 гадз. — канфэр. 4-х груп. Разгляд новых праграм.

— У 17 гадз. — працит канфэр. прыродаведаў.

—У 19 гадз. — сход валізатараў.

Дом Камасьветы. У 19 гадз. сэмінар. кіраўнікоў делегацкіх пунктаў (пак. № 19).

— З 19 да 21 гадз. (пак. 21) індывід. кансульт. па палітэканоміі т. **Лур'е.**

Антырэлігійны унівэрсытэт. Чарговыя заняткі у-ту на пэдфаку (фіз. аўд.). Пач. у 18 г. 15 м. Яўка абавяз.

Дзяржплян (Пляц Волі, 5). Даклад т **Гольмштока** для прапагандысцкай групы Мен. Акр. АЗВТУ аб нацыянальнай палітыцы савецкай улады. Выклік. тт.: Берман, Кацман (ф-ка «Акцябр»), Азэрынкі, (зав. «Бальшавік»), Нэйман (п/к «Паліграф»), Фрыд, Гольдзін і Шэрасфальд (абутковая ф-ка), Раніп, Шац, Эльнэрын, Эстэркінд, Капялевіч, Румянцава (працасьветнікі).

ЗАЎТРА

БДУ. У 19 гадз. (прыродазнаўч. корпус, аўд. 4) пасядж. асьпір. гістарыч. сэмінару. Абгаварэньне і спрэчкі па дакладзе т. **Скардзіса:** прадпасылкі аграрнае рэформы 1861 г. на Ковеншчыне. Запраш. асьпір. — гістор. БАН і Камвузу.

Пасяджэньне экскурсійнага бюро 1-й Усесбел. с.-г. выстаўкі. Пач. у 11 гадз. у залі пасядж. ЦСПСБ (Дом Працы, 2-гі паверх, пак. 10) Запраш. прадст. ЦП саюзу, ад дырэкцыі выстаўкі, т. Таўкач, ПКА—**Сьцепанюк,** Гарсавету—**т. Крузмат,** АК КП(б)Б—т. **Кірштэйн,** АК ЛКСМ—т. **Мятліцкі** і прадстаўн. рэд. газэт. Яўка абавязкова. Пач. у 19 гадз.

Клюб саўгандальслужачых. У 20 гадз. праходзіць чыстку працаўнікі цэнтр. апарату МПРК. Просьба да супрацоўнікаў ЦРК і навіначыкаў прыняць удзел.

Ашчадную кніжку—у быт працоўнага
Рабочыя брыгады—аб справе ашчаднасьці

Рабочыя брыгады, якія прымалі ўдзел у правядзеньні месячніка зьберажэньняў, зьвярнуліся з адозвай да працоўных, у якой адзначаецца, што сёлета ў часе месячніка члены прафсаюзаў вывялі вялікую актыўнасьць. Аб гэтым сьведчыць і масавае ўступленьне ў касы ашчаднасьці рабочых і служачых. З 1-га лютага па 1 красавіка ўцягнута ў касы ашчаднасьці каля 55.000 чал.

Але побач з актыўнасьцю мас нагладзіліся і фармальныя адносіны да месячніка як з боку некаторых мясцовых савецкіх установ, так і прафсаюзных арганізацый, якія, спасылаючыся на «аб'ектыўныя» ўмовы, не аддавалі месячніку належнае ўвагі. У выніку гэтага, замест укладаў у 3 млн. рублёў, якія павінен быў даць месячнік нашаму сацыялістычнаму будаўніцтву, за гэты час у ашчадкасы паступіла новых укладаў каля 600 тысяч руб. Заданьне па месячніку выканана ў БССР толькі на 20 проц.

Разьвіцьцё ашчаднае справы не адпавядае ягонаму шпаркім тэмпам сацыялістычнага будаўніцтва. **Ашчадная справа яшчэ ня выйшла на сапраўдны шырокі шлях ахопу ўсіх працоўных мас. У самым ашчадным апараце мае месца бюракратызм і цяганіна.** Да гэтага часу яшчэ няма пасталінай дапамогі ашчаднай справе з боку нашай грамадзкасьці. Ашчадная справа яшчэ не заняла належнага месца ў сыстэме нашай работы на мясцох. Нашы прафсаюзныя арганізацыі яшчэ ня ўключылі ў штодзенны плян сваёй працы шырокае азнаямленьне членаў прафсаюзаў з роляй і значэньнем справы ашчаднасьці ў нашым будаўніцтве. Слабы ўдзел у ашчаднай справе прымаюць камісіі садзейнасьці дзяржкредыту.

Пры правядзеньні месячніка зьберажэньняў асабліва ярка выявілася супраціўленьне варожых элемэнтаў. Кулацтва вяло агітацыю супроць ашчадных кас. Пашыраліся чуткі, што ўклады ў касы быццам-бы ня будуць вернуты. Масавае ўступленьне рабочых і служачых у ашчадкасы ў часе месячніка зьберажэньняў зьявілася лепшай формай рэагаваньня на вылазку кулацтва.

Рабочыя брыгады заклікаюць усіх працоўных яшчэ больш згуртавацца вакол ашчадных кас. У адказ на падрыхтоўку вайны супроць СССР, у адказ на варожую агітацыю кулацкіх элемэнтаў супроць дзяржкредыту, рабочыя брыгады кідаюць у гушчу працоўных мас БССР лёзунг: **«Усе вольныя сродкі праз дзяржпазыкі і ашчадкасы на патрэбы сацыялістычнага будаўніцтва, ніводнага працоўнага без ашчаднае кніжкі».**

Рабочыя брыгады заклікаюць прафсаюзную грамадзкасьць дапамагаць укараненьню ашчаднае справы сярод батрацтва і бяднякоў - серадняцкіх мас вёскі. Трэба, каб уся маса працоўных укладчыкаў ашчадкас як старых, так і тых, што зрабілі першы ўзнос у часе месячніка зьберажэньняў, карысталася касамі ашчаднасьці ў сваім штодзенным быце. Зусім зразумела, што барбоўка ўкладчыкаў павінна насіць сурова-добраахвотны характар.

С.

3-ю пазыку—сэзоньнікам

Усяго 2 і 3 дзяржпазыкамі ахоплена звыш 80 проц. усіх арганізаваных рабочых. Слабей пашыраліся гэтыя пазыкі **сярод сэзоньных рабочых.**

Гэта катэгорыя рабочых у сваёй асноўнай масе паходзіць з вёскі і ня мела магчымасьці у часе падпісной кампаніі падпісацца адначасова з іншымі-арганізаванымі рабочымі. Вось чаму зараз сярод сэзоньнікаў праводзіцца спэцыяльная кампанія па падпісцы на пазыку на ільготных умовах. Гэта кампанія праходзіць пад лёзунгамі: **двухтыднёвы заработак у пазыку індустрыялізацыі.**

Асноўную работу на папулярызацыі падпіскі на пазыку сярод сэзоньнікаў праводзяць прафесыянальныя арганізацыі сумесна з камісіямі садзейнічаньня дзяржкредыту.

Продаж аблігацый робіцца паводле афіцыйнага справачнага курсу. У тых выпадках, калі сэзоньнікі застаюцца на рабоце на працягу цядоўгага часу, або калі склад іх цякучы, **аблігацыі прадаюцца за наяўны разьлік.** У іншых выпадках продаж праводзіцца ў растэрміноўку.

Растэрміноўка даецца на той тэрмін, на працягу якога сэзоньнік будзе заняты на працы. Утрыманьне сум за аблігацыі робіцца пры выдачы заработнай платы роўнымі часткамі. Калі сэзоньнікі пакідаюць работу да поўнай аплаты **аблігацый,** дык ім даецца права недакладнага атрыманьня палкам аплочаных аблігацый.

У выпадку жаданьня адъяжджаючых сэзоньнікаў даслаць а месца сталага жыхарства суму, якое не хапае да поўнай аплаты яго аблігацый, ім даецца трохмесячны тэрмін. На атрыманьні гэтай сумы сэзоньніку дармова дасылаецца аблігацыі на пошце на паказаны ім адрас.

А. Л.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

ТЫ ЯШЧЭ НЕ КУПІЎ БІЛЕТАЎ 4-й ЛЕТАРЭІ АСОАВІЯХІМУ?

ТЫРАЖ
білетаў 4 разрада 4-й пётарэі Асоавіяхіму адбудзецца ў Менску 2—3 мая г. г.
БУДЗЕ РАЗЫГРАНА 3.000 выйгрышаў)—(НА СУМУ 45.074 руб.
БІЛЕТ КАШТУЕ 50 кап.
Спяшайцеся купіць білеты! Узмацняйце абарону!
Білеты прадаюцца ў арганізацыях Асоавіяхіму.

Пашыраная нарада вытворчых ячэек МОПР'у г. Менску.
КЛЮБ Прадсьвяты Сёньня, 22 красавіка
Менскі Акруговы камітэт МОПР'у —)СКЛІКАЕ(— агульна-гарадзкую пашыраную нараду вытворчых ячэек МОПР'у
Парадак дня: 1. Даклад аб новых формах і мэтадах работы ў рэпрэсіўнымі нарыс—дакл. тав. КАЛМЫК. 2. Аб узмоце ў сьвяткаваньні 1-га Мая.
На нараду павінны зьявіцца ўсе члены бюро калектываў, цехавых і вымезных ячэек, абсярчыкі членскіх узносаў і члены рэвізійных камісій.
Уваход па білетах, разасланых на ячэйках. Пасьля нарады—новы нумар кіно-фільма „Браты здзлёку". Запрашаюцца члены ФЗМК і культкамісіі.
Пачатак роўна а 7 гадз. увеч. Менскі Акруговы Камітэт МОПР'у.

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР Сезон 1929-930 году (чацьверты) у Менску
Аўторак, 22 красавіка, для вучнятрафсэкцыі
КАЛІ ПЯЮЦЬ ПЕЎНІ Юр. Юр'іна п'еса у 7 абразох, 5 пеньнях.
Рэшта білетаў у касе тэатру. Пачатак а 8 гадз.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР. Пятніца, 25 красавіка
Адзіны канцэрт Дзяржаўнага Квартэту імя Вільома
У праграме: Бэтховен, Чайкоўскі, Грыг, Казіцкі, Чуркін.
Пачатак а 9 гадз.
Білеты штодзенна ў касе тэатру і ў рабочай касе.

На падставе пастановы Прамплану ВСНГ Беларусі ад 16-га лютага 1930 г.
ГОЛКАВЫ АДДЗЕЛ Віцебскай Дзяржаўнай Анулярнай фабрыкі (б. голкавая фабрыка Левінсона)
выдзелены ў самастойную гаспадарчую адзінку
і існуе пад назвай: „Віцебская Дзяржаўная Голкавая фабрыка"
Па усіх справах, што датычацца да гэтай фабрыкі, просім зварачацца ў кіраўніцтва фабрыкі ў г. Віцебску, Сурская вул., 18, тэл. 2-27, кіраўніцтва фабрыкі.

ВЕЛМЭТАЛЯАБ'ЯДНАНЬНЮ ПАТРЭБНЫ ДЛЯ РАБОТЫ Ў КІРАЎНІЦТВЕ
ІНЖЫНЭР-будаўнік
ІНЖЫНЭР-мэханік
ІНЖЫНЭР па плянаваньні рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў і абмену вопытам,
ІНЖЫНЭР па плянаваньні вытворчасьці,
ІНЖЫНЭР па міцейшай справе,
ІНЖЫНЭР па прафасьвеце,
ІНЖЫНЭР па тэхніцы бясьпечнасьці і охоны працы,
ТЭХНІК-будаўнік,
ТЭХНІК па тэхніцы нармаваньня
ЭКАНАМІСТЫ па групе заводаў с.-г. машын і мэт. выробаў,
ЭКАНАМІСТЫ па групе заводаў машына-будаўніцтва
АПЛАТА ПА ЗГОДЗЕ.
Прапановы накіроўваць на адрас: Менск, Рэвкаўская, 8. Велмэталяаб'яднаньню. Тэлефоны: 10-1, 10-23, 13-70.
ВЕЛМЭТАЛЯАБ'ЯДНАНЬНЕ.

Усіх падпісчыкаў, якія не атрымліваюць прымовах часоп. «Партыйны Работнік», просяць зварачацца ў гал. канторку газ. «Зьвязда» — Савецкая 63, тэл. 7-81.

Вышла з друку і рассылаецца падпісчыкам часопісь
„СЕЛЬСКАЯ і ЛЯСНАЯ ГАСПАДАРКА"
№ 1 (нн. 9) за 1930 г.
ЗЬМЕСТ:
1. П. РАЧЫЦКІ—За берагом у навукова-дасьледчай справе.
2. ПРАФ. У. У. ВІНЭР—Дасьледчая справа у галіне расьлінгадоўлі БССР.
3. АЛЯКСЕЙ СЮБАРАЎ—Сучасная задача навуковага садоўніцтва.
4. П. С. САЎКІН—Значэньне кармовых угоддзяў у народнагаспадарчым жыцьці БССР.
5. П. САЎКІН—Культура лугоў і пастбішч на тарфяным балоце.
6. А. І. ЛАПІА—Якая навушная патрэба для Беларусі.
7. М. А. ДАРОШКІН—Пашкоджаньне азімага жыта Fusarium nivale на палёх Барысаўскага раёну.
А. ДУБІНА—Ад забясьпечэньня обытарой да вытворчай калгаснай кавэтрацыі.
Р. Ф. МЭЭРСОН—Праблема мэханізацыі льнаводзтва.
К. І. КІПРЫЯНЕЦ—Сельска-Гаспадарчы Усебеларускай Выстаўцы.
НОВІКАЎ—Спроба апісаньня Клімавіцкага раёну, Магілёўскай акругі, як першага раёну суцэльнай калектывізацыі.
Хроніка.
Бібліяграфія.
Падпіскай прымаецца: у выдавецтве Навукова-Дасьледчага Інстытуту імя Леніна (Менск, Шырокая, 26) і на ніжняй лодзе.
ПАДПІСНАЯ ПЛАТА.
На 1 год. (6 нумароў)—5 р. на 6 мес.—2 р. 50 к., пасобны нумар 1 р. 20 к.
Выдавецтва БНДІ.

ЛЯЧЭБНІЦА— МЕНСКАГА КАМІТЭТУ ГАРАДЗКОГА УЗЕМАДАНАЖНОГА
Ленінская, № 25, побач з 2-м Домам Саветаў, тэл. 12-66
АДКРЫТА ад 9 гадз. ран. да 9 г. увеч.
Прыём хворых па ўсіх спэцыяльнасьцях:
па ўнутраных, хірургічных, жаночых, вочных, хваробах вуха, горла і носа, скурана-венэрычных, страўніцкіх, нэрвовых.
Электра-ольвета-лячэньне і кварц адкрыты з 11—2 гадз. дня і 5—8 гадз. увеч.
Рэнтген (аўмы, прасьвечваньні, лячэньне) адкрыт з 4 г 30 м. да 9 г. увеч.
Прыём хэміка-бактэрыялёгічных аналізаў. Аптэка.
ЗУБНЫ ГАБІНЭТ адкрыт з 9 г. раніцы да 9 г. увеч. штодзенна.
Кансультацыя прафэсароў па ўсіх спэцыяльнасьцях на папярэднім запісе.
Урачэбная дапамога на дому па ўсіх спэцыяльнасьцях. Запісь з 9 гадз. раніцы да 2 гадз. дня.
Дзяжурства дактароў з 2 гадз. дня да 9 гадз. увеч.
Начное дзяжурства дактароў ах 9 гадз. увеч. да 7 гадз раніцы.
Прыём хворых па лекавых кніжках камітэту
Для ўсіх іншых грамадзян за агульна-даступную дыфэрэнцыяваную плату.

Падпішэцеся загадзя на газэту „ЗЬВЯЗДА" на МАЙ

Бел. МБІТ склікае на 23-га красавіка, а 7-ай гадз. увеч. у клюбе Гарсавету
агульна-гарадзкі сход спэцыялістых—членаў ІТС г. Менску
ПАРАДАК ДНЯ: 1. Задачы і мэты Палесэмэлёма і вытворчы плян на бягучы сэзон.
Запрашаюцца ўсе інж.-тэх. работнікі г. Менску.
Прэзыдыум Бел. МБІТ.

ЦП САЮЗУ САЎГАНДАЛЬСЛУЖАЧЫХ
СЁНЬНЯ, а 8 гадз. увечары ў памяшканьні клюбу «Саўгандальслужачы» склікае
МІТЫНГ-ЗЬЛЁТ УСІХ ВЫЛУЧЭНЦАЎ,
што працуюць на ўстановах гор. Менску, якія аб'яднаны саюзам саўгандальслужачых
На гэты мітынг абавязкова яўка вылучэнцаў, старшынь МК і кіраўнікоў устаноў. Запрашаюцца для ўдзелу ў мітынгу рабочыя, якія шэфствуюць над установамі, а таксама ўсе члены саюзу саўгандальслужачых.
На мітынгу рапартуюць МК: ЦРК, ВСНГ і ЛКФ аб становішчы вылучэньства, умовах працы вылучэнцаў і інш., а таксама рапартуюць па эдняму вылучэнцу: Дзяржкомбеду, ЦРК і ЦСК аб умовах іх працы.

ПРАДАЮЦЦА БОЧКІ 3-ПАД ФАРБЫ і шкляныя балёны ад дісьлаты.
Савецкая 63, друк. «Зьвязды» зварачацца да заг. гас. ад 9 да 11 гадз. ран.

Абазначэньне несапраўдных дакументаў
Згубленыя і ўкрадзеныя
наступныя дакументы: лічыць несапраўднымі:
Камсам. бл. № 200118, выд. Мен. АК ЛКСМ, уз. бл. саюзу СТЛР, котр. выч. на імя Гарбачова Ю. Б. 679-681
Бліг. № 49 Варонскай Н. М., выд. курсамі кіякароў ЦПШ. 682
Бліг. № 0815021, выд. Мен. АК КП(б)Б, на імя Беляцкага Казанова І. І. 683-684
Каап. кн. Боскіна А. М., выд. Мен. прытар. спаж. т-ва «Земляроб» 685
Мотр. кн. Макарэвіча Н. Г., выд. Мен. ЗАГСам. 686
Кн. ашчадкасы за №№ 4890 і 4891, выд. Мен. ашчадкасы 689—690
Чырвонаарм. кн. Карунова М. К., выд. 2 арт. палком 691
Вуч. карт. № 0901814 і пуцёўка, выд. Віцебск. АК КП(б)Б на імя Пліскова В. А. 692—693
Пасьведч. № 244 Фельдмана Н. М., выд. Кіячэнск. РВК 694
Пасьведч. Фельдмана В. Л., выд. Кіячэнск. РВК 695
Чл. бл. саюзу мэталістых Хільчанка А. С. 696
Чырвонаарм. кн., выд. 5 стр. палком, котр. кн., выд. Смаляніч. спаж. т-вам Кромень М. Ф. 697—698
Вавок. бл., выд. Пухавіч. РВК, дапрыз. кн., выд. Самахвал. РВК на імя Тарасава Я. Н. 699—700
Вайск. кн., выд. Ленінгр. ваенкам., пашпарт, выд. Ленінгр. міліцыяй, камандыровачнае пасьведч., выд. выкан. «Крест. Правда» на імя Бем С. Г. 701—703
Чл. бл. саюзу будаўнікоў Эйнгера Я. М. 704
Бірж. талён Гінзбург С. Х., выд. Мен. біржай працы 705
Вуч. квіток кн. Церашкевіча А. Ф., выд. Астр.-Гарадз. РВК 706
Чл. бл. саюзу будаўнікоў № 6-269 Міхайлоўскага І. С. 707
Каап. кн. № 1149 Лісіцкага М. О., выд. Мен. прытар. спаж т-вам «Земляроб» 708
Вайск. бл. выд. Н.-Поўгарадзк. ваенкам., пашпарт, выд. Мен. міліцыяй на імя Віцагрэдскага К. Ф. 709
Пашпарт Батвінка Б. М., выд. Ратамск. с/с. 701
Інж.-тэхн. бл. № 772, выд. Мен. Акр. адз. працы, два больн. бюлетэні, выд. Камароўск. амбул. на імя Ласіцкага К. Б. 711-712

Для здачы абвестні у газэту „ЗЬВЯЗДА" звяніце на тэл. 7-81

50 К. кошт публікацыі аб згубе дакумента

Друкарня газэты «Зьвязда» Менск.
Менск. Галаўлітлер № 337.